WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 СНЕЖНЯ 2009 г.
СУБОТА
№ 241
(26599)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Завочная «прамая лінія»

## ХІРУРГІЯ ОРГАНАЎ СТРАВАВАННЯ

Пытанні, звязаныя з хірургічнымі хваробамі органаў стрававання (у тым ліку стрававода, страўніка, жоўцевых пратокаў, кішэчніка), можна адрасаваць **доктару медыцынскіх навук, прафесару, загадчыку кафедры хірургіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кіраўніку Рэспубліканскага цэнтра рэканструктыўнай хірургічнай гастраэнтэралогіі і калапракталогіі Аляксандру Уладзіміравічу ВАРАБ'ЮЮ.** Адказы на пытанні, пакінутыя ў рэдакцыі «Звязды» па нумары **8 (017) 287 18 29 да 30 снежня**, будуць надрукаваныя ў газеце на пачатку новага года.

## Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў у Казахстане

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у Казахстан. Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў. Планаецца, што цэнтральнай тэмай абмеркавання стане фарміраванне Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі. Акрамя таго, у час гутаркі кіраўнікоў дзяржаў закрануць тэматыку АДКБ, а таксама прадоўжаць пачатую ў Мінску размову па актуальных пытаннях развіцця ЕўрАзЭС.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПАДАРАЖЭЛІ ЦЫГАРЭТЫ

З 19 снежня павышаюцца рознічныя цэны на некаторыя маркі цыгарэт. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі №195. Дакумент прадугледжвае павышэнне цэнаў, як на цыгарэты, якія вырабляюцца ў Беларусі па праграме імпартазамяшчэння, так і на некаторыя маркі, якія імпартуюцца ў краіну.

20 снежня — Дзень супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі

## СПЕЦСЛУЖБА ЗАБЯСПЕЧЫЛА СТАБІЛЬНАСЦЬ

**Напярэдадні прафесійнага свята старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь Вадзім ЗАЙЦАЎ пажадаў ветэранам дабрабыту ў сем'ях, а дзейным супрацоўнікам — працягваць выконваць сваю місію — забяспечваць мір і спакой, заставацца сумленнымі і непадкупнымі, упэўненымі ў сваёй справе.**

Паводле слоў Вадзіма Зайцава, самы важны вынік працы ў гэтым складаным, крызісным годзе дасягнуты: забяспечана стабільнасць беларускага грамадства, у якім няма праяў адкрытага тэрарызму, адкрытай злачыннасці, дзе беларускі народ адчувае сябе досыць упэўнена. Высокую ацэнку стану спраў у нашым грамадстве даюць і грамадзяне суседніх краін.

Работа, якая праводзілася ў цесным узаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі органамі, дазволіла своечасова лакалізаваць негатыўныя працэсы ў стратэгічных галінах эканомікі, знізіць яе знешнюю ўразлівасць, асабліва ў энергетычным сектары. Адным з вынікаў гэтай работы з'яўляецца папярэджанне нанясення страт краіне ў памеры 1,24 млрд долараў. У адказ на сучасныя выклікі бяспецы цэнтральна-еўрапейскага рэгіёна атрымала развіццё супрацоўніцтва са спецслужбамі Украіны, Польшчы, Літвы, Францыі, Германіі і Італіі. КДБ Беларусі выступіў нацыянальным каардынатарам міжнароднай спецаперацыі па барацьбе са злачынствамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій, якая праводзіцца пад эгідай Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Падчас аперацыі была выяўлена і спынена дзейнасць 288 інтэрнэт-рэсурсаў, якія прапагандавалі ідэі экстрэмізму і іншых супрацьпраўных дзеянняў. Ва ўзаемадзеянні з замежнымі партнёрамі праваахоўнымі органамі ўзбуджаны 323 крымінальныя справы. Спынена дзейнасць 7 суб'ектаў гаспадарання — ілжэпрадпрымальніцкіх структур, якія займаліся незаконным вывадам грашовых сродкаў за мяжу.

Сёлета ліквідавана 13 каналаў, у тым ліку міжнародных, кантрабанднай пастаўкі наркатычных сродкаў на тэрыторыю Беларусі, у судовым парадку спынена дзейнасць 5 арганізаваных злачынных груп гвалтоўнай накіраванасці. З незаконнага абароту канфіскаваны 90 адзінак агнястрэльнай зброі, 15 кг выбуховых рэчываў, звыш 40 тысяч боепрыпасаў. Спынена дзейнасць звыш 300 службовых асобаў, якія ўчынілі карупцыйныя злачынствы.

Актуальнымі задачамі органаў дзяржбяспекі з'яўляюцца недапушчэнне нанясення шкоды ў працэсе будаўніцтва беларускай АЭС, кантроль над перамяшчэннем і распаўсюджваннем ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў. У 2010 годзе плануецца правядзенне маштабных вучэнняў па наладжванні бяспекі атамнай станцыі з удзелам КДБ, МУС, МНС і іншых ведамстваў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Як нас дураць

## «ЗАМАНЬВАЛІ» ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕМ ЗА МЯЖОЙ

**Больш за паўтары сотні беларусаў «ахвяравалі» свае грошы тром фірмам, якія абяцалі пасадзейнічаць ім у працаўладкаванні за мяжой.**

Але ўзятыя на сябе абавязкі, як мяркуюць следчыя, выконваць не збіраліся. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, ёсць падставы казаць пра тое, што фірмы банальна завалодалі сродкамі падманутых людзей. У прыватнасці, гутарка ідзе пра адну айчынную, а таксама прадстаўніцтвы дзвюх замежных арганізацый — ТАА «Магніт 1», «SLCC Corporation (Канада) і AL-Hayat Tours (Private) Limited» (Пакістан), якія ажыццяўлялі сваю дзейнасць на тэрыторыі нашай краіны са снежня 2002 па кастрычнік 2003 года.

Згаданыя арганізацыі размяшчалі рэкламу аб сваіх паслугах у сродках масавай інфармацыі. Ахвотных, якіх зацікавіла прапанова, хапала і з апошнімі заключаліся дагаворы па працаўладкаванні. Прычым да кліентаў фірмы ставіліся па-рознаму: з кагосьці браліся «ўзносы» ў суме каля 300 тысяч беларускіх рублёў, а з іншых «выцягнулі» і 900 долараў ЗША. Грошы, якія шукальнікі лепшай працы за мяжой выкладвалі за атрыманне такой магчымасці, арганізацыі пералічвалі на рахункі замежных банкаў. Паводле самых папярэдніх ацэнак, такім чынам з падманутых беларусаў «назбіралі» каля 40 тысяч долараў ЗША.

Між іншым, на сёння следчымі вызначаны асобы далёка не ўсіх пацярпелых ад махлярскіх дзеянняў гэтых фірмаў. Таму падманутыя згаданымі арганізацыямі людзі могуць паведаміць пра гэта ў дзяжурную часць Цэнтральнага РУУС па тэлефонах: 288 77 02, 288 02 02. Па факце дзеянняў трох фірмаў, якім інкрымінуецца «крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі» і «махлярства», заведзены крымінальныя справы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 28 ДЕКАБРЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О нормативах расходования средств из прибыли в 2010 году.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 25 декабря), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 28 декабря), по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – до 25 декабря 2009 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.**

УНП 100325912.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛЭНЕРГОСТРОЙ» (ПРОДАВЕЦ)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже здания склада-навеса, об. пл. 1542,8 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Пуховичский район, г.п. Свислочь, промплощадка Минской ТЭЦ-5. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 216 800 000 бел. руб. Площадь земельного участка 0,8394 га. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.10.2009. Аукцион состоится **29.12.2009** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.12.2009** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

## ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ РАБОТЫ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ — НАЙВАЖНЕЙШЫ НАПРАМАК ДЗЕЙНАСЦІ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь БАТУРЫ Б. В. на закрыцці трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання (18 снежня 2009 г.)*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя, журналісты!

Больш за год прайшло з таго моманту, як цяперашні склад Савета Рэспублікі пачаў ажыццяўленне сваіх паўнамоцтваў. Для нашай краіны гэта быў няпросты час, які запатрабаваў ад нас, парламентарыяў, актыўнасці, ініцыятывы і наватарскага падыходу. Па-першае, нам неабходна было аператыўна ўключыцца ў заканатворчы працэс.

Па-другое, па даручэнні Кіраўніка дзяржавы — значна павысіць эфектыўнасць работы мясцовых органаў самакіравання. І па-трэцяе, — дастойна праводзіць інтарэсы Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне.

За гэты год Савет Рэспублікі ўзмацніў сваю дзейнасць па ўсіх названых напрамках. Заканатворчасць не была адарвана ад рэальнасці, ад праблем і чаканняў простых людзей. У мэтах вывучэння правапрымяняльнай практыкі ў поўнай меры задзейнічаны патэнцыял семінараў і круглых сталоў. На аснове іх вынікаў праводзілася дасканалая прававая экспертыза праектаў.

Акрамя таго, на ўсіх этапах падрыхтоўкі законаў Савет Рэспублікі працаваў у адзінай камандзе ўсіх галін дзяржаўнай улады. Укараняліся і новыя формы работы. Так, па найбольш важных для грамадства законапраектах праводзіліся сумесныя пасяджэнні некалькіх камісій з удзелам прадстаўнікоў зацікаўленых дзяржаўных органаў і грамадскасці. Такая форма сябе апраўдала, і ў далейшым мы будзем яе ўдасканальваць.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***



Фота БЕЛТА.

## ЧАС ПАТРАБУЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ РАШЭННЯЎ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на закрыцці трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання*

Паважаныя дэпутаты, запрошаныя і журналісты!

Завяршае работу трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Яна праходзіла на фоне складаных працэсаў, абумоўленых як агульнасусветнымі тэндэнцыямі, так і ўнутранымі фактарамі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэта шмат у чым вызначыла змястоўнае напаўненне сесіі, якая ў цэлым атрымалася не радавой.

Галоўным яе вынікам стала прыняцце заканадаўчых рашэнняў, якія маюць прынцыповае значэнне для краіны. Дэпутаты ўнеслі свой уклад ва ўмацаванне эканомікі і сацыяльнай сферы, развіццё дзяржаўных і дэмакратычных інстытутаў, узмацненне пазіцый краіны на міжнароднай арэне.

У ходзе сесіі разгледжана 114 пытанняў. Прыняты 31 законапраект у першым чытанні, 34 — у другім, 31 законапраект аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў. Разгледжана 5 часовых дэкрэтаў Кіраўніка дзяржавы.

Асаблівую значнасць для краіны мае прыняцце праекта Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2010 год». Нягледзячы на тое, што яго падрыхтоўка вызначалася як ніколі жорсткімі рамкамі, мы выйшлі на бюджэт развіцця, які канцэнтруе рэсурсы на фінансаванні нацыянальных прыярытэтаў і дзяржаўных праграм. Пры гэтым не зніжана планка дасягнутага ўзроўню сацыяльных паслуг і гарантый. Больш таго, у дакуменце закладзены рост бюджэтных асігнаванняў на ахову здароўя, адукацыю, культуру, спорт і сацыяльную палітыку.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***



Фота БЕЛТА.

## ГАРЭЛКА ПАДАРАЖЭЛА НА 5%

Фіксаваныя рознічныя цэны на гарэлку ў стандартнай многаабаротнай шклянай тары і мінімальныя адпускныя цэны на іншыя віды алкагольнай прадукцыі моцам вышэй за 28 % вырастуць у Беларусі ў сярэднім на 5%. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі №196.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.12.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 880,00 |
| ▲ 1 еўра | 4 143,74 |
| 1 латвійскі лат | 5 856,63 |
| 1 літоўскі літ | 1 199,35 |
| 1 чэшская крона | 157,81 |
| 1 польскі злоты | 990,46 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 93,75 |
| 1 украінская грыўня | 361,22 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 30,7187 |
| UAH | 38,2931 |
| 1000 BYR | 10,6997 |
| EUR | 44,1766 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Антыкрызісная эканоміка



# ДАРОГІ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

КУП «БРЭСТАБЛДАРБУД»

## Нягледзячы на эканамічны крызіс, Брэсцкія абласныя дарожнікі знаходзяць магчымасць падтрымліваць дарожную гаспадарку рэгіёна ў аптымальным стане

**Мы ўжо неаднойчы знаёмілі чытачоў з вопытам работы адной з перадавых арганізацый дарожнай галіны Беларусі камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Брэстаблдарбуд». Калектыў пад кіраўніцтвам Пятра СКАРАБАГАЦЬКІ сапраўды шмат чаго дасягнуў: тут аднымі з першых у краіне засвоілі «халодныя» тэхналогіі, укаранілі сістэму кантролю якасці работ ISO 9001, падрыхтавалі спецыялістаў, сабралі тэхніку і засвоілі самыя сучасныя тэхналогіі для правядзення ўсяго комплексу дарожных работ... А галоўны паказчык работы мясцовых дарожнікаў — гэта камфортныя, бяспечныя, праязджальныя ў любую пару года і ў любое надвор'е дарогі. Дарогі для людзей.**

**Нагодай для нядаўняй нашай камандзіроўкі на Брэстчыну стаў... эканамічны крызіс. Дакладней, нас цікавілі метады яго пераадолення, якія ўзялі на ўзбраенне ў «Брэстаблдарбудзе». А тое, што дарожнікі не стануць сядзець склаўшы рукі нават ва ўмовах скарачэння фінансавання, мы не сумняваліся.**

**Як паказвае практыка, крызіс — выдатны селекцыянер. І дзелавыя, прагрэсіўныя кіраўнікі атрымліваюць шанц ярка сябе праявіць.**

— Сусветны эканамічны крызіс найбольш ярка паказаў, што для кіраўніка не можа быць негалоўных задач — толькі, калі ўсе пытанні вырашаюцца ў комплексе, калі ўвага надаецца кожнай дробязі, можна дабіцца станоўчага выніку, — тлумачыць сваю антыкрызісную стратэгію **Генеральны дырэктар КУП «Брэстаблдарбуд» Пётр СКАРАБАГАЦЬКА.** — Аднак я ўсё ж вылучыў бы два кірункі, якія ў перыяд такіх катаклізмаў трэба паставіць у аснову асноў: гэта працоўны калектыў і аб'ект работы. Прычым калектыў — на першым месцы, дарогі — на першым месцы. Злучыць гэтыя два інтарэсы ў адзін у новых умовах няпроста. Але паставіўшы задачу: не скараціць ніводнага работніка, людзей зарплатай не крыўдзіць, а наадварот, з улікам росту цэнаў пастаянна забяспечваць рост заробкаў, прычым не проста так, а за кошт росту прадукцыйнасці працы, мы з ёй справіліся. Такі падыход пры любых эканамічных фармацыях дае магчымасць зарабіць прыбытак. А калі ёсць прыбытак, можна заахвоціць лепшага дарожніка, лепшага механізатара, лепшага грэйдарыста, лепшага вадзіцеля... І людзі, разумеючы, што аб іх клапоцяцца, што іх працу цэняць, — працуюць з душой, цэняць сваё працоўнае месца. І менавіта сукупнасць вось такіх маленькіх «зярнятак» дае вялікі, багаты «колас»...

Другая важная задача — пры тым вялікім скарачэнні фінансавання (у параўнанні з мінулым годам практычна на 40 працэнтаў — **Аўт.**) не дапусціць пагаршэння тэхніка-эксплуатацыйных характарыстык нашых дарог. Больш за тое, нягледзячы на эканамічны крызіс трэба не толькі выстаяць, але і развівацца. Развівацца і дарогам, і прадпрыемству. Скажу без падманнай сціпласці — нам гэта ўдалося. Практычна ўсе нашы арганізацыі не згарнулі, а нават павялічылі аб'ёмы работ у цэлым, аб'ёмы рамонтных работ, аб'ёмы работ па ўтрыманні дарог... Як вынік, сёлета мы адрамантавалі звыш 350 кіламетраў дарог, што перавышае даведзены план. І нам, і карыстальнікам дарог вельмі прыемна, што ўся сетка адпавядае патрабаванням, забяспечвае праязджальнасць і бяспеку руху. Улічваючы тое, што большасць дарог пабудаваныя 30—40—50 гадоў таму і маюць пратэрмінаваныя тэрміны па капітальным рамонце, гэта даволі значнае дасягненне.

Трэцяя пазіцыя — гэта эканоміка. Крызіс можна перамагчы толькі магутнымі эканамічнымі дасягненнямі. Іншага няма. Ні дзяржава, ні хто іншы не «падорыць» дастатковае фінансаванне. Грошы трэба ўмець зарабіць, умела выкарыстаць, пастаянна дабіваючыся эфектыўнасці. Безумоўна, можна пайсці па самым простым шляху і, напрыклад, пабудаваць кіламетр дарогі за мільярд рублёў. А можна крыху паруліцца, засвоіць і выкарыстаць новыя сучасныя тэхналогіі, новыя матэрыялы, больш эфектыўныя метады работы і зэканоміць 10—20 працэнтаў сродкаў. Цэлы шэраг падобных эканамічных метадаў, якія мы з поспехам прымяняем, дазваляе нам выконваць даведзеныя задачы і дабівацца эканамічнага поспеху. Так будзе і надалей, бо мы настроены на добрую, пазітыўную працу.

Адной з найважнейшых праблем ва ўмовах крызісу для нас з'яўляецца недафінансаванне. З нашага пункту гледжання — гэта недапушчальна. Каб людзі не заўважылі гэтага па стане дарог, дарожнікам давялося паруліцца. Змяншэнню фінансавання мы супрацьпаставілі пошук работы па прамых дагаворах, па дагаворах з недарожнымі арганізацыямі, з тымі, хто хоча ўпарадкаваць свае тэрыторыі, пад'езды, падходы... Такім чынам намі выканана да 65 працэнтаў работ. Сёння мы бяромся практычна за любую працу, на выкананне якой у нас ёсць ліцэнзіі. Гэта і ўвесь комплекс работ па добраўпарадкаванні аграгарадкоў — сёлета выканана больш за 250 аб'ектаў, — і работа на дваровых тэрыторыях, і на дарогах розных катэгорый.

***— Пётр Андрэевіч, якімі такімі сваімі «ноу-хау» вы здолелі здзівіць калегаў з Францыі?***

— Трэба адзначыць, што французы прасунуліся значна далей за нас у выкарыстанні найноўшых тэхналагічных распрацовак. Аднак і мы, своечасова зразумеўшы, што без новага наперад не прасунемся, трымалі руку на пульсе тэхнічнага прагрэсу: праз інтэрнэт, тэхнічную літаратуру, падчас стажыровак за мяжой знаёміліся з усімі найноўшымі тэхналогіямі. Хутка прыйшло разуменне, што нам аптымальна падыходзіць менавіта французскі варыянт выкарыстання новых матэрыялаў. Такім чынам, узяўшы ад французаў крыху эмульгатараў і дадаўшы іх да нашых мясцовых будаўнічых матэрыялаў — гравію, вады, бітуму — мы атрымліваем выдатны будаўнічы матэрыял — гравія-эмульсійную сумесь. Калегаў з Францыі вельмі здзівіла, што мы разам з нашым галіновым інстытутам у самыя сціслыя тэрміны стварылі нарматыўна-прававую базу, навукова-тэхнічную дакументацыю на выкарыстанне новых матэрыялаў і тэхналогій. Такога няма ні ў Польшчы, ні ў Расіі. Ды і ў самой Францыі ёсць праблемы з тамтэйшай бюракратыяй. Больш за тое, у нас на Брэстчыне ўжо два-тры гады працуюць участкі дарог, выкананыя па такой «халоднай» тэхналогіі. Так, у свой час мы ўзялі на сябе пэўную прафесійную рызыку. Крызісныя праявы, нястачу фінансавання чымсьці трэба было перамагаць, кампенсаваць. І гэта рызыка аказалася апраўданай. Сёння намі выкарыстоўваюцца ўжо некалькі метадаў будаўніцтва і рамонту дарог з прымяненнем гравійна-эмульсійных сумесяў. Так, ГЭСы кладуцца ў аснову дарогі і накрываюцца слоем асфальтабетону. Пры добрым надвор'і можна ўвогуле абысціся без «гарачых» матэрыялаў, паклаўшы два слаі ГЭСаў. Аснову з ГЭСаў можна «накрыць» паверхневай апрацоўкай...



**Па новай вуліцы ў новае жыццё — так мы назавем фотаздымак, зроблены ў вёсцы Белавусаўшчына Пружанскага раёна. У гэтыя дні будаўнікі аўтадарог завяршаюць тут добраўпарадкаванне, а мясцовыя жыхары (у тым ліку маладыя мамы з дзіцячымі каляскамі) знаёмяцца са зручнасцямі новых дарог. Вадзіцелю Сяргею КАРАВАЮ (на здымку ў цэнтры) прыемна чуць словы падзякі.**

Безумоўна, для магістральных дарог ці аўтабанаў з вялікай транспартнай нагрузкай такая тэхналогія не падыходзіць, а на мясцовых дарогах 4-5 катэгорый гэта проста выдатнае інжынернае рашэнне. І для французаў, якія пастаянна параўноўваюць нас з суседзямі, стала поўнай нечаканасцю тое, што мы вырашылі пытанні, звязаныя з выкарыстаннем гэтай тэхналогіі яшчэ больш дакладна, чым гэта робіцца і ў Расіі, і ў самой Еўропе: і па часе, і па канкрэтнасці, і па афармленні дакументаў, і па смеласці рашэнняў...

***— Пётр Андрэевіч, работа вашага аб'яднання па падрыхтоўцы Кобрына да Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2009» атрымала самыя высокія ацэнкі на ўсіх узроўнях. А як Вы ацэньваеце работу падраздзяленняў «Брэстаблдарбуда» па выкананні гэтай адказнай задачы?***

— Зразумела, што калі праведзенай рабоце па падрыхтоўцы Кобрына да «Дажынак» дае станоўчую ацэнку кіраўнік дзяржавы, губернатар вобласці — мне вельмі прыемна з імі пагадзіцца і падзякаваць. У сваю чаргу словы ўдзячнасці хачу выказаць усяму калектыву аб'яднання. Падчас выканання задання па Кобрыне нашы ўпраўленні былі пастаўлены ва ўмовы ў шмат разоў больш складаныя, чым усе іншыя арганізацыі, што працавалі поруч з намі. Патлумачу чаму. Большасць атрымала заданні за год-паўтара да правядзення свята хлебаробаў і прыступіла да работы. Для нас жа, акрамя таго, што добраўпарадкаванне 25 кіламетраў вуліц трэба было правесці ў сціслыя тэрміны, асноўная складанасць заключалася ў тым, што на гэтых вуліцах на той момант не было інжынерных сетак. І мы па гадзінах, па хвілінах і па секундах чакалі, калі ж нашы сумежнікі пакладуць трубы, каналізацыю, каб нам распачаць работу. Каб нагнаць страчаны не па нашай віне час, даводзілася працаваць і пры святле вулічных ліхтароў, і пры святле аўтамабільных фараў... З заданнем удалося справіцца толькі дзякуючы высокай арганізаванасці калектыву, высокай адказнасці інжынернай службы, высокаму прафесіяналізму дарожных рабочых і механізатараў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

# ЧАС ПАТРАБУЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ РАШЭННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вялікая ўвага ў ходзе сесіі была ўдзелена пытанням лібералізацыі эканамічнай дзейнасці, стварэння камфортных умоў для работы арганізацый усіх формаў уласнасці.

Менавіта гэтым мэтам служаць прынятыя на сесіі дакументы, якія прадугледжваюць больш дакладныя і зразумелыя правілы дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, рэгістрацыі некаторых аб'ектаў нерухомай маёмасці. Важны крок зроблены насустрач малому і сярэдняму бізнэсу, найбольш мабільнаму сектару эканомікі, які здольны хутка асвойваць новыя нішы на рынку.

У развіцці дзелавой актыўнасці вельмі многае залежыць ад прадуманай падатковай палітыкі. І тое, што мы выходзім на поўную кадыфікацыю падатковага заканадаўства, значна спрашчае парадак падаткаабкладання, зніжае падатковую нагрузку, сведчыць аб прынцыповай пазіцыі дзяржавы ў такіх значных пытаннях, як падтрымка айчыннага вытворцы і стварэнне прывабнага інвестыцыйнага клімату.

Не меншую ролю тут адыграе і зніжэнне адміністрацыйнага націску на суб'екты гаспадарання. У гэтым плане трэба адзначыць не толькі скарачэнне (практычна на чвэрць) колькасці адміністрацыйных працэдур, але і, што асабліва важна, сур'ёзнае звужэнне сферы прымянення адміністрацыйнай адказнасці. Нагадаю, што праектам Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці», прынятым у другім чытанні, такая адказнасць выключаецца больш як па 60 саставах адміністрацыйных правапарушэнняў, па 50 саставах — зніжаюцца санкцыі.

Спрашчэнню механізма адміністравання таксама будзе садзейнічаць прававое забеспячэнне развіцця электроннага дакументаабароту і электроннага дэкларавання.

У ходзе сесіі разгледжаны шэраг законапраектаў, якія датычацца канкрэтных галін эканомікі. З улікам патрабаванняў часу перагледжаны нормы законаў аб транспарце, аб гандлі і аб рэкламе. У першым чытанні прыняты законапраекты, накіраваныя на ўдасканаленне кіраўнічай дзейнасці ў будаўніцтве, стымуляванне навукі, развіццё такой важнай для інавацыйнай эканомікі сферы, як прававая ахова аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

Актыўнае прасоўванне нашых тавараў на сусветны аграрны рынак паставіла на парадак дня пытанні павышэння іх якасці і адпаведнасці патрабаванням замежных партнёраў. Адносна прадукцыі жывёлагадоўлі гэтыя праблемы шмат у чым дапаможа зняць прыняцце Закона «Аб ветэрынарнай дзейнасці», праект якога разгледжаны ў першым чытанні.

Наша краіна мае ўсе перадумовы да таго, каб заняць дастойнае месца і на рынку турыстычных паслуг. На дасягненне гэтай мэты накіраваны папраўкі, унесеныя ў Закон «Аб турызме».

Падводзячы вынікі работы па прававому забеспячэнню сацыяльнай сферы, перш за ўсё адзначу праект Кодэкса аб адукацыі, які прайшоў стадыю першага чытання. З яго прыняццем завершыцца фарміраванне цэласнай сістэмы нацыянальнага заканадаўства аб адукацыі. Але, што больш важна, гэты дакумент створыць неабходныя ўмовы для захавання лідзіруючых пазіцый нашай краіны ў гэтай галіне. На перспектыву распрацаваны і прыняты намі праект Закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», палажэнні якога накіраваны на рост сацыяльнай актыўнасці моладзі, узмацненне яе ролі ва ўсіх сферах жыцця грамадства.

У цэнтры ўвагі дэпутатаў пастаянна знаходзяцца пытанні абароны сям'і і дзяцінства. І гэта невыпадкова: маральны клімат у грамадстве, яго сацыяльны дабрабыт бяруць свае вытокі ў сям'і. На асенняй сесіі асноўны акцэнт быў зроблены на ўзмацненні работы з праблемнымі сем'ямі, нядбайнымі бацькамі, барацьбы з п'янствам, наркаманіяй і іншымі відамі сацыяльных хвароб, якія пагражаюць сямейнаму дабрабыту.

Свой уклад у ўмацаванне здароўя нацыі ўнясуць навацыі ў экалагічным заканадаўстве, а таксама Закон «Аб аказанні псіхалагічнай дапамогі», праект якога разгледжаны ў першым чытанні.

Новыя эканамічныя і сацыяльныя рэаліі патрабуюць удасканалення дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, развіцця дэмакратычных інстытутаў. Прычым асабліва важна, каб заканадаўчыя рашэнні ў названай сферы былі сугучныя з часам і не ўносілі дысананс у грамадска-палітычнае жыццё. Менавіта з гэтых пазіцый трэба разглядаць папраўкі ў выбарчае заканадаўства, якія адлюстроўваюць рэальна існуючы ў краіне ўзровень палітычна-сацыяльных адносін і ствараюць перадумовы для іх далейшага развіцця.

У такім жа ключы праводзілася работа па ўдасканаленні сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання, абнаўленню прававых асноў дзейнасці Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, удасканаленню грамадзянскага судаводства.

Неабходнай умовай паспяховага правядзення дэмакратычных пераўтварэнняў з'яўляецца здольнасць дзяржавы гарантаваць стабільнасць, законнасць і правапарадак у краіне. Гэтым абумоўлена прыняцце законаў, накіраваных на прадухіленне карупцыі і крыміналізацыі эканомікі. Сур'ёзная ўвага на сесіі ўдзелена таксама пытанням удасканалення правааховнай дзейнасці.

У ліку важнейшых прававых рашэнняў па ўмацаванні абароназдольнасці і нацыянальнай бяспекі трэба адзначыць праекты законаў аб статусе ваеннаслужачых, аб дзяржаўных сакрэтах, аб дзейнасці органаў пагранічнай службы.

Узросшая дынаміка грамадскага жыцця запатрабавала пашырэння дыялогу з дзяржаўнымі органамі і грамадскасцю. Плённасць такога падыходу пацвярджаюць вынікі парламенцкіх слуханняў па праблеме развіцця заканадаўства ў сферы жыллёвага крэдытавання. Разгляд гэтага пытання з розных пунктаў гледжання даў магчымасць вызначыць прынцыпы мадэрнізацыі існуючых схем фінансавання жыллёвага будаўніцтва з максімальным улікам інтарэсаў дзяржавы, інвестараў, забудоўшчыкаў і грамадзян.

Застаюцца запатрабаванымі і такія формы работы, як выязныя пасяджэнні, семінары, круглыя сталы. Практыку іх правядзення мы будзем развіваць, тым больш што ў міжсесійны перыяд нас чакае падрыхтоўка шэрагу законапраектаў, якія маюць вялікае грамадскае значэнне. У сувязі з гэтым хачу падкрэсліць неабходнасць больш актыўнага ўдзелу дэпутатаў у рабоце над праектамі законаў, якія сёння знаходзяцца ў Палаце прадстаўнікоў, міністэрствах, Урадзе, Нацыянальным цэнтры заканадаўства і прававых даследаванняў, з тым, каб забяспечыць іх якасную распрацоўку і прыняцце.

У ходзе сесіі выразна выявілася тэндэнцыя павелічэння аб'ёму і інтэнсіўнасці работы па фарміраванні міжнароднай дагаворна-прававой базы. Асабліва тут трэба вылучыць ратыфікацыю 15 дагавораў па стварэнні Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Іх рэалізацыя дасць магчымасць замацаваць рэжым свабоднага гандлю, атрымаць дадатковыя рычагі для прасоўвання беларускай прадукцыі на рынкі дзяржаў-партнёраў.

Дастаткова дынамічнай была і міжнародная дзейнасць Палаты прадстаўнікоў, асноўныя вынікі якой выявіліся ва ўмацаванні існуючых і ўстанаўленні новых сувязяў, вызначэнні больш эфектыўных форм супрацоўніцтва.

Важнейшай падзеяй у рамках Саюзнай дзяржавы стала правядзенне 36-й сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Сярод асноўных яе рашэнняў — прыняцце праекта саюзнага бюджэту на 2010 год, які прадугледжвае фінансаванне больш як 40 міждзяржаўных праграм.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў плённа працавалі ў міжпарламенцкіх асамблеях СНД і ЕўрАзЭС, Парламенцкай Асамблеі АДКБ, у першую чаргу на форумах гэтых арганізацый, якія прайшлі ў Санкт-Пецярбургу. Правядзенне шэрагу мерапрыемстваў па лініі Міжпарламенцкай Асамблеі ЕўрАзЭС і Парламенцкай Асамблеі АДКБ у Беларусі дало магчымасць азнаёміць нашых замежных калег з эканамічнымі магчымасцямі краіны, намеціць новыя напрамкі супрацоўніцтва.

Прадаўжалася ўзаемадзеянне з еўрапейскімі парламенцкімі інстытуцыямі. Тут трэба адзначыць візіт у Беларусь дакладчыка Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях Меўлюта Чавушаглу, наш удзел у фарміраванні парламенцкай структуры ЕЎРАНЕСТ у рамках ініцыятывы Еўрапейскага Саюза «Усходняе партнёрства», і ў прапрацоўцы праблематыкі, звязанай з увядзеннем у Беларусі маратарыю на пакаранне смерцю.

Дэпутаты актыўна выкарыстоўвалі трыбуну парламенцкіх структур Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, удзел у мерапрыемствах пад эгідай ААН і Паўночнага Савета, для таго, каб заявіць пазіцыю нашай краіны па пытаннях процістаяння глабальнаму эканамічнаму крызісу, барацьбы са змяненнем клімату і іншых актуальных праблемах сучаснасці.

Сярод важнейшых падзей трэба назваць візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Кітайскую Народную Рэспубліку. У ходзе візіту адбыліся сустрэчы з членамі Пастаяннага камітэта Палітбюро Камуністычнай партыі Кітая — Старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, Старшынёй Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая, Намеснікам Старшыні Дзяржаўнага Савета. Усяго адбылося 9 афіцыйных сустрэч і сустрэча ва Усекітайскай федэрацыі жанчын. Абмеркаваны пытанні міжпарламенцкага супрацоўніцтва, узаемадзеяння на міжнароднай арэне. У рамках візіту падпісана пагадненне аб развіцці супрацоўніцтва паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Экспартна-імпартным банкам Кітая, у адпаведнасці з якім прадугледжваецца адкрыццё крэдытнай лініі на суму 5,7 мільярда долараў ЗША для фінансавання сумесных інвестыцыйных праектаў у Рэспубліцы Беларусь. Беларускай дэлегацыяй была аказана палітычная падтрымка ў рэалізацыі праектаў вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш» і Мінскага трактарнага завода па стварэнні з кітайскімі партнёрамі сумесных прадпрыемстваў у г. Харбін.

Пазітыўнымі былі і вынікі візіту беларускіх парламентарыяў у Турэцкую Рэспубліку.

Важную ролю ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва з Азербайджанскай Рэспублікай адыграў афіцыйны візіт яе парламенцкай дэлегацыі ў Беларусь і падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж парламентамі.

Упершыню з моманту стварэння Палаты прадстаўнікоў мы прымалі ў сябе японскіх калег.

Дынаміка двухбаковых кантактаў не знізіцца і ў міжсесійны перыяд. Цяпер вядзецца падрыхтоўка візітаў беларускіх парламентарыяў у Арменію, Ізраіль, Італію, Латвію, Сірыю.

У сваю чаргу нашу краіну наведаюць парламенцкія дэлегацыі Украіны і Ірландыі. У бліжэйшыя дні мы будзем прымаць дэлегацыю Рабочай групы ПА АБСЕ па Беларусі. Чакаецца візіт старшыні падкамітэта па Беларусі Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях — новага дакладчыка па Беларусі Сінікі Хурскайнен.

Нашы дэпутаты прымуць удзел у VIII сесіі міжнароднага грамадскага аб'яднання «Славянскі парламенцкі саюз», у зімовай сесіі ПА АБСЕ. Асабліва трэба адзначыць намечанае на сакавік 2010 года правядзенне ў г. Мінску пад эгідай Паўночнага Савета міжнароднай канферэнцыі на тэму «Роля палітыкаў у зменлівым грамадстве».

Прадоўжыцца работа па падрыхтоўцы ўзважанага рашэння па пытанні прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі з улікам інфармацыі, атрыманай беларускімі парламентарыямі ў час наведвання Каўказскага рэгіёну ў лістападзе гэтага года.

Зразумела, у ходзе сесіі не перапынялася наша работа ў выбарчых акругах. І тут хацелася б выказаць удзячнасць прадстаўнікам мясцовай улады за канструктыўнае ўзаемадзеянне і актыўны ўдзел у вырашэнні праблем насельніцтва.

У 2010 годзе краіна ўступае ў чарговы цыкл выбарчых кампаній. У красавіку адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, якія будуць праводзіцца на аснове абноўленага выбарчага заканадаўства. Безумоўна, парламентарыі павінны садзейнічаць таму, каб гэтыя выбары прайшлі дэмакратычна і ў строгай адпаведнасці з законам.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за плённую работу і павіншаваць усіх прысутных у гэтай зале з надыходзячым Новым годам і Калядамі.

Жадаю вам моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў і ўдачы ва ўсіх справах.

# ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ РАБОТЫ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ — НАЙВАЖНЕЙШЫ НАПРАМАК ДЗЕЙНАСЦІ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У адпаведнасці з даручэннем Кіраўніка дзяржавы па ўзмацненні работы органаў мясцовага самакіравання асноўную ўвагу мы ўдзялілі рэалізацыі дзяржаўных праграм адраджэння вёскі і развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў. Вынікі праведзенага ў гэтым годзе аналізу паказваюць, што прадастаўленыя гэтымі праграмамі магчымасці выкарыстоўваюцца далёка не ў поўнай меры. Намі выпрацаваны адпаведныя рэкамендацыі па актывізацыі іх выканання мясцовымі органамі ўлады.

Да вырашэння ўскладзенай на Савет Рэспублікі стратэгічнай задачы прыцягваюцца ўсе без выключэння супрацоўнікі яго Сакратарыята. Так, яны на пастаяннай аснове прымаюць удзел у прыёмах грамадзян, праводзімых дэпутатамі непасрэдна на месцах. У 2010 годзе Саветам Рэспублікі будзе рэалізаваны комплексны план мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці работы органаў мясцовага самакіравання. Ужо з 21 снежня ў Сакратарыяце пачне працаваць «гарачая лінія» ў мэтах аказання аператыўнай дапамогі старшыням Саветаў па розных пытаннях іх дзейнасці.

На жаль, не ўсе рашэнні, што прымаюцца Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, рэалізуюцца на практыцы. Нам неабходна радыкальна змяніць гэту сітуацыю. Вы ўсе прадстаўляеце рэгіёны Беларусі, таму рэалізацыя рашэнняў Савета па ўзаемадзеянні — ваш «святы» абавязак!

За мінулы год значна актывізавалася міжнародная дзейнасць Савета Рэспублікі. Асноўнымі яе задачамі былі правядзенне эканамічных інтарэсаў нашай краіны і ўмацаванне яе становучага іміджу на міжнароднай арэне. Больш часты і плённы характар набылі адносіны з нашымі заходнееўрапейскімі калегамі, што тлумачыцца ўзаемным імкненнем да наладжвання канструктыўнага і раўнапраўнага партнёрства. Прадаўжаецца работа па будаўніцтве Саюзнай дзяржавы і развіццю інтэграцыйных працэсаў на еўразійскай прасторы. Захаваліся і традыцыі ўзаемадзеяння з рознымі міжпарламенцкімі аб'яднаннямі ў вырашэнні глабальных праблем сучаснасці.

Паважаныя калегі!

У ходзе трэцяй сесіі асноўная ўвага ўдзялялася ўдасканаленню дзеючага заканадаўства. Мы адобрылі значныя для жыцця нашай краіны законапраекты ў сферы эканомікі, мясцовага самакіравання, аховы навакольнага асяроддзя і выбарчага заканадаўства.

Пры нашым актыўным удзеле адпрацаваны галоўны фінансавы дакумент краіны на 2010 год. Захаванне дасягнутага якаснага ўзроўню сацыяльнай абароны насельніцтва, падтрымка рэальнага сектара эканомікі і рэалізацыя праграмы жыллёвага будаўніцтва сталі асноўнымі яго характарыстыкамі. Акрамя таго, бюджэт сфарміраваны такім чынам, каб забяспечыць строгі кантроль за расходаваннем сродкаў.

Вялікае значэнне для эканомікі краіны мае адобраная намі Асаблівая частка Падатковага кодэкса. У ёй вызначаны парадак прымянення кожнага з рэспубліканскіх і мясцовых падаткаў, збораў, а таксама асаблівых рэжымаў падаткаабкладання. Па кожнаму падатковаму плацяжу ўстанаўліваюцца склад плацельшчыкаў, аб'ект падаткаабкладання, падатковая база, памеры ставак і льгот. Пасля яго ўступлення ў сілу будуць заканадаўча замацаваны мерапрыемствы па лібералізацыі ўмоў гаспадарчай дзейнасці.

Палажэнні разгледжанага намі законапраекта «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» накіраваны на павышэнне палітыка-прававога статусу інстытута мясцовага самакіравання. Для кансалідацыі намаганняў мясцовых Саветаў дэпутатаў пры вырашэнні праблем, што ўзнікаюць, і прасоўвання рэгіянальных ініцыятыў ім прадастаўлена права аб'ядноўвацца ў асацыяцыі або саюзы.

Адзін з прыярытэтаў нашай дзяржавы — выхаванне моладзі, клопат аб яе маральным і фізічным здароўі. Моладзь — наша будучыня. Менавіта яна з'яўляецца важным суб'ектам сацыяльных зменаў, вялізнай наватарскай сілай. У сувязі з гэтым Савет Рэспублікі ўдзяліў пільную ўвагу праекту Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», і многія з вас унеслі свой уклад у яго дапрацоўку. Закон вызначае асноўныя напрамкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і меры па яе рэалізацыі. Важна тое, што гэты акт накіраваны на вырашэнне праблемы грамадзянскага і прафесійнага станаўлення маладых людзей, іх актыўнага ўдзелу ў жыцці дзяржавы.

Саветам Рэспублікі адобраны таксама шэраг законапраектаў у сферы аховы навакольнага асяроддзя. Сярод іх адзначу законапраект «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе». Палажэнні гэтага законапраекта маюць двайную накіраванасць — садзейнічаюць забеспячэнню экалагічнай бяспекі і спрашчаюць бюракратычныя працэдуры. На думку спецыялістаў, пасля ўступлення ў сілу гэтага закона колькасць праектнай дакументацыі, якая прадстаўляецца на дзяржаўную экалагічную экспертызу, зменшыцца на 60—70 працэнтаў, а тэрміны яе разгляду скароцяцца ў два разы.

Грамадска значным было рэфармаванне выбарчага заканадаўства нашай краіны. Удакладнены парадак фарміравання выбарчых камісій, спрошчана працэдура вылучэння і рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і дэпутаты, пашыраны магчымасці правядзення перадвыбарнай агітацыі. У цэлым унесеныя змяненні і дапаўненні будуць садзейнічаць дэмакратызацыі выбарчага працэсу і павышэнню даверу да яго.

У перыяд сесіі важнае месца займала работа па развіцці дагаворна-прававой базы міжнароднага супрацоўніцтва. Асабліва адзначу ратыфікаваны намі пакет пагадненняў, якія датычацца стварэння Мытнага саюза ў рамках ЕўрАзЭС.

Стварэнне Мытнага саюза выклікала вялікі рэзананс у грамадстве. Было шмат пытанняў і сумненняў. Сёння гэтых сумненняў быць ужо не павінна. Перавагі гэтага аб'яднання для Рэспублікі Беларусь відавочныя. Утварэнне агульнага рынку для трох краін будзе садзейнічаць паглыбленню вытворчай кааперацыі. Краіны-ўдзельніцы змогуць свабодна гандляваць паміж сабой, павысіцца канкурэнцыя на іх рынках, будуць створаны новыя рабочыя месцы. Больш эфектыўна будзе выкарыстоўвацца транзітны патэнцыял дзяржаў, якія ўваходзяць у Мытны саюз. Іх прадпрыемствы атрымаюць лепшыя ўмовы для выхаду на міжнародныя рынкі. Разам з тым не варта забываць аб тым, што эканамічная інтэграцыя — гэта працяглы працэс і вынікі яго будуць відаць не адразу.

Больш высокай ступенню інтэграцыі павінна стаць стварэнне адзінай эканамічнай прасторы, а менавіта гарманізацыя тарыфаў, гандлёвых рэжымаў, нацыянальнага заканадаўства. Нам, парламентарыям, трэба будзе зрабіць яшчэ вельмі шмат для дасягнення гэтай мэты.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Хачу яшчэ раз падкрэсліць значнасць нашай ролі ў каардынацыі дзейнасці органаў мясцовага самакіравання, перш за ўсё, праз Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. На апошнім яго пасяджэнні мы разгледзелі работу мясцовых Саветаў у рамках Года роднай зямлі. Нягледзячы на вялізныя сродкі, укладзеныя ў ажыццяўленне прыродаахоўных мерапрыемстваў, засталося яшчэ шмат прыкладаў безгаспадарчасці і абыякавага стаўлення да прыроды, не выкарыстоўваецца патэнцыял аграэкатурызму. Па выніках пасяджэння дадзены канкрэтныя даручэнні, якія датычацца пытанняў комплекснага добраўпарадкавання і ўтрымання тэрыторый, а таксама падтрымання парадку на зямлі.

Нам усім неабходна разумець, што Год роднай зямлі — гэта не разавая акцыя, а працяглая карпатлівая работа па выхаванні сапраўднай любові да роднай зямлі. І мы павінны зрабіць усё, што ад нас залежыць, каб пытанні навядзення парадку рэгулярна і своечасова вырашаліся менавіта на мясцовым узроўні. Гэта наша непасрэдная задача як прадстаўнікоў рэгіёнаў!

Паважаныя калегі!

Завяршэнне сесіі не азначае, што ваша работа ў якасці членаў Савета Рэспублікі прыпыніцца на час парламенцкіх канікулаў. Міжсесійны перыяд з'яўляецца не менш інтэнсіўным і значным. Мы прадоўжым работу з законапраектамі, якія ўжо вясной будуць разглядацца ў Нацыянальным сходзе. Перш за ўсё гэта датычыцца праектаў Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Закона «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». Нам неабходна дапрацаваць іх палажэнні такім чынам, каб яны забяспечвалі сістэмнае рэгуляванне грамадскіх адносінаў у гэтых сферах. У сувязі з тым, што вялікія надзеі мы ўскладаем на развіццё малога бізнэсу ў рэгіёнах, прашу вас актыўна ўключыцца ў абмеркаванне палажэнняў адпаведнага законапраекта і ўнесці свае прапановы. Тым больш, што Кіраўніком дзяржавы нам дадзена канкрэтнае даручэнне — «быць у авангардзе сістэмных пераўтварэнняў у Беларусі».

Ваш актыўны ўдзел у вырашэнні праблем раёна, горада, вёскі, асобнага грамадзяніна павінен стаць асновай вашай работы як члена Савета Рэспублікі ў міжсесійны перыяд.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Вясной наступнага года пройдуць выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Гэта падзея асаблівай важнасці. Ад дасведчанасці выбаршчыкаў, іх грамадзянскай пазіцыі і пачуцця адказнасці ў дзень выбараў залежыць наша будучае. Таму заклікаю вас актыўна ўключыцца ў правядзенне ідэалагічнай работы ў вашых раёнах.

На заканчэнне віншую ўсіх вас з надыходзячым Новым годам і Калядамі!

Дзякуй за ўвагу!

Комиссия по организации и проведению аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков Минского райисполкома сообщает о том, что на основании решения Минского райисполкома от 18.12.2009 года № 8019 с аукциона, объявленного на 22 декабря 2009 года **снимается с торгов Лот 10:** право аренды земельного участка под строительство магазина розничной торговли с пристроенным кафе-пиццерией площадью 0,0347 га, расположенного по адресу: Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, кадастровый номер земельного участка 623683403101006116.

Сумма задатка, внесенная участниками аукциона, будет возвращена им в течение 5 рабочих дней.

## Абзац

**◢ У Гродне тралейбус збіў жанчыну. З тлумачэнняў вадзіцеля вынікае, што яна пачала пераходзіць вуліцу па пешаходным пераходзе на забараняльны сігнал святлафора. Кіроўца сцвярджае, што бачыў жанчыну, якая стаяла каля пераходу, але паколькі ехаў на зялёнае святло, тармазіць не стаў. Аднак жанчына нечакана ступіла на дарогу. Нягледзячы на экстраннае тармажэнне, пазбегнуць сутыкнення не ўдалося. 54-гадовая гродзенка загінула.**

## Поўны абзац

◢ П'яны Старшыня Савета дэпутатаў Чырвонаармейскага раёна Чалябінскай вобласці на аўто ўрэзаўся ў перапоўненую маршрутку. Адна з пасажырак са шматлікімі пераломамі і страсеннем мазгоў шпіталізаваная. Да гонару дэпутата, ён не збег з месца здарэння — вярнуўся ў «Волгу» і заснуў. Інспектары пабудзілі яго і папрасілі падуць у трубку, але віноўнік ДТЗ толькі адмоўна ківаў галавой. Даішнікі клапатліва падтрымлівалі яго пры спробах захаваць вертыкальны стан, але безвынікова — народны выбраннік упаў на дарогу. Учора стала вядома, што старшыня савета і па сумяшчальніцтве сакратар мясцовага аддзялення «Адзінай Расіі» падаў у адстаўку з абодвух пастоў.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## АСТРАНАМІЧНАЯ ЗІМА

**надыйдзе ў Беларусі 21 снежня ў 19 гадзін 47 хвілін. Самая доўгая ноч чакае беларусаў з 21 на 22 снежня, 22 снежня будзе самым кароткім днём года — яго даўжыня складзе ўсяго 7 гадзін 24 хвіліны.**

Зямля атрымае найменшую колькасць сонечнага цяпла, і ўлада зімы замацуецца канчаткова. А пачынаючы з 26 снежня, ноч будзе станавіцца ўсё меншай.

У народзе свята зімовага сонцастаяння яшчэ называюць днём Ганны зімовай, нагадвае БЕЛТА. Ён асабліва адзначаўся цяжарнымі жанчынамі і пчалярамі.

Першым забаранялася на працягу сутак брацца за якую-небудзь важную работу. Заўважылі, што калі на Ганну зімовую ясна і светла — гэта да яснага і марознага 31 снежня, калі ж пахмурна і на дрэвах шэрань — да цёплага надвор'я.

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 29 декабря 2009 г. в 10.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Журавинка» в составе Лота № 1:**

| Наименование имущества | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-59234 (здание мини-кафе) общей площадью 43,3 кв.м |
|---|---|
| Адрес | Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, д. 1 а |
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 |
| Начальная цена продажи, рублей без учета НДС | 66 617 880 |
| Размер задатка, руб. | 6 661 788 |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Журавинка» – р/с 3012790150019 в ОАО «Белинвестбанк» отделении № 831 г. Бобруйск Головного филиала по Могилевской области, код 153801712, УНП 700067623, ОКПО 14775616 |
| Площадь земельного участка | 0,0418 га. Кадастровый номер 741000000003000926. Правовой режим – право постоянного пользования |
| Условия продажи | Аукцион без условий |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | По договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| Срок подачи документов, осмотра объекта и внесения задатка | по 28 декабря 2009 г. включительно |

*Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 181 от 25 сентября 2009 г.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**г. ВИТЕБСК** **30.12.2009**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 4. | Неиспользуемое здание магазина № 43 с подвалом и сетью, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, 71, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 240/С-28899 (здание магазина № 43 с подвалом), одноэтажное кирпичное здание 1989 года постройки, фундамент – ж/бетонный, перекрытие – ж/бетонное, крыша совмещенная, общей площадью 2163 кв. м; - капитальное строение с инвентарным номером 240/С-29803 (сооружение специализированное энергетики электрические сети к магазину № 43), протяженностью 165 м. Земельный участок: с кадастровым номером 242400000001004376, площадью 0,1949 га, для обслуживания здания бывшего магазина, сроком аренды 64 года. Использование – под объект неустановленного назначения. | 674058779 | 67405877 |
| С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ | | | | |
| 5. | Не завершенное строительством здание склада заполнителей бетона, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, промзона Ксты, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объектов недвижимости: фундаменты, степень готовности – 100 %, стены – нет, частично поперечные перегородки – 20 %, общая степень готовности – 8,8 %, общая площадь 2350 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223887000001000030, площадью 0,1237 га для обслуживания здания производственного назначения, сроком аренды 55 лет. | 494080 | 49408 |
| 6. | Не завершенное строительством здание бетоносмесительного цеха, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Экиманьский сельсовет, в 0,4 км к востоку от деревни Ксты, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объектов недвижимости: фундаменты, стены, перекрытия, степень готовности – 100 %, лестничные марши, проемы – 85 %, общая площадь 1240 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223887000001000088, площадью 0,0307 га для обслуживания здания бетоносмесительного цеха, сроком аренды 55 лет. | 148930 | 14893 |
♊ **БЛІЗНЯТЫ**. Поспех абавязкова прыйдзе да вас, але толькі калі прыкладзяце максімум намаганняў да яго дасягнення. Не саромейцеся праявіць інтэлектуальныя здольнасці — гэта ніколі нялішне. Калі перад вамі будзе праблема выбару, лепш параіцца з сябрамі і роднымі. Яны могуць даць каштоўныя рэкамендацыі. Не спрабуйце выканаць працу, якой заняліся, у адзіночку — такія паводзіны толькі сапсуюць адносіны з навакольнымі і адаб'юцца на канчатковым выніку.

♋ **РАК**. Надышоў час для нарошчвання актыўнасці ў сферы прафесійнай дзейнасці. Тыдзень таксама нядрэнны для творчых пошукаў. Па магчымасці, будзьце больш уважлівымі і асцярожнымі, паколькі поспех не любіць памылак. Будзе магчымасць наладзіць любыя сувязі і кантакты, якія толькі захочаце. У аўторак можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Серада праблематычная з-за магчымага назапашвання негатыўных эмоцый. Вам неабходна разрадзіцца, толькі, дзеля ўсяго святога, не на навакольных. У чацвер, калі ўжо прынялі рашэнне, то не варта потым прыслухоўвацца да парадаў знаёмых. Вырашайце ўсе праблемы самастойна.

♌ **ЛЕЎ**. Час пачынаць феерверкі і іншыя радасці, якімі можна займацца за тыдзень да Новага года. Як, вы яшчэ не святкуеце? Гэта проста бязладдзе, бо назапашаная стомленасць можа праявіцца самым недарэчным чынам. Так што з ёй неабходна тэрмінова разабрацца. Але калі вы яшчэ працуеце, то самы час заняцца папяровымі і арганізацыйнымі справамі. Працаваць пажадана па вольным графіку, бо ў цвёрдыя рамкі з перапынкам на абед упісацца не будзе ніякай магчымасці. Вам неабходна спакойнае становішча — толькі тады вы зможаце вырашыць шматлікія назапашаныя праблемы.

♍ **ДЗЕВА**. Не варта кідацца з галавой у рызыкоўныя мерапрыемствы, якія абяцаюць нешта нерэальнае. Будзьце асабліва асцярожнымі ва ўсім, што звязана з абяцаннямі, — як дробнымі, так і сур'ёзнымі. Ужо дадзеныя давядзецца ў дакладнасці выканаць, але новыя даваць было б неразумна. У аўторак варта звяртаць увагу на знакі лёсу. У пятніцу ваш высакародны ўчынак па стаўленні да дзелавых партнёраў ацэняць па вартасці.

♎ **ШАЛІ**. Тыдзень спрыяльны для наладжвання важных сувязяў. Можна нават звярнуцца да такіх аўтарытэтных людзей, якіх пры звычайных акалічнасцях вы б не рызыкнулі занепакоіць. Не выключана, што частку ўвагі давядзецца пераключыць на вырашэнне праблем людзей, якія залежаць ад вас. Але гэтыя намаганні акупяцца. У аўторак можаце разлічваць на дапамогу сяброў. У сераду паступіць доўгачаканая інфармацыя, якая, верагодна, моцна вас пацешыць і дасць новыя магчымасці для самаўдасканалення. У чацвер магчымая канфліктная сітуацыя, звязаная з грашыма.

♏ **СКАРПІЁН**. З'явіцца як схільнасць да лунання ў аблоках, так і ілюзорныя ўяўленні пра свае здольнасці. У выніку, калі нешта не атрымаецца, можаце знервавацца мацней, чым варта было б. Глядзіце на рэчы рэалістычна і спадзявайцеся толькі на сябе — тады нішто не зможа сапсаваць добры настрой. У сераду і чацвер паспрабуйце надаваць больш увагі блізкім людзям. Нядзелю ж, наадварот, трэба прысвяціць сабе.

♐ **СТРАЛЕЦ**. Самай непрыемнай падзеяй тыдня могуць стаць нападкі нядобразычліўцаў або неабгрунтаваныя прэтэнзіі дакучлівых сваякоў. І тых, і іншых варта ігнараваць. Пасля стомнага і бязладнага панядзелка як след выспіцеся — тады са свежымі сіламі адправіцеся на працоўныя подзвігі. Будзе як ніколі важны добры калектыў — калі такога няма на працы, жыццёва неабходна кантактаваць з прыемнымі вам людзьмі па вечарах. У сераду давядзецца адстойваць свае інтарэсы без староннай дапамогі — выкарыстайце сваю жыццёвую практыку. У выхадныя дні можа пацешыць новая інфармацыя.

♑ **КАЗЯРОГ**. Вельмі пажадана адправіцца ў вандраванне: вас могуць чакаць прыгоды або таямнічыя падзеі. У панядзелак варта абараніць сябе ад залішняй працы. У сераду знайдзіце час вывучыць бягучае становішча спраў ва ўсіх яго аспектах, але не рабіце паспешных высноў, пакуль не пачуеце меркаванне каго-небудзь, не ўцягнутага ў сітуацыю. У пятніцу варта скарыстаць усё сваё абаянне для дасягнення кар'ерных вышыняў, калі, вядома, вы не знойдзеце яму лепшае прымяненне. Не выключаныя адкрыцці і пазітыўныя змены: першым чынам гэта датычыцца тых, хто працуе ў сферы навукі і вышэйшай адукацыі.

♒ **ВАДАЛЕЙ**. Добры настрой і душэўны ўздым дазволяць хутка і лёгка вырашаць складаныя прафесійныя пытанні. У панядзелак поспех будзе спрыяць юрыстам і праваабаронцам. Аўторак — удалы дзень для пачатку заняткаў музыкай. У пятніцу не імкніцеся ахапіць неабсяжнае, бо жаданне перарабіць адначасова вялікую колькасць спраў можа прывесці да launch ператамлення і нервовых зрываў. Субота — вельмі ўдалы дзень для старту новых праектаў. Толькі неабходна загадзя прадумаць пытанне стварэння трывалай фінансавай базы пад іх.

♓ **РЫБЫ**. Калі рэзкае слова будзе гатова сарвацца з вашых вуснаў, падумайце аб магчымых наступствах. Толькі ваша вытрымка зможа ўтрымаць падзеі ў мірным рэчышчы. Вы здолееце пераўтварыць нявыгадную сітуацыю ў карысную для сябе, калі добра падумаеце перад тым, як дзейнічаць або гаварыць. Ваша энергічнасць дазволіць атрымаць поспех у шматлікіх справах. У пятніцу могуць наведаць новыя арыгінальныя ідэі, паспрабуйце запомніць, а яшчэ лепш — запісаць іх. Яны спатрэбяцца ў найбліжэйшай будучыні.

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (12 снежня). Па гарызанталі:** Фісташка. Сажалка. Шпінат. Такса. Кірза. Бут. Лікёр. Араб. Міндаль. Орт. Касяк. Асот. Рэха. Рэп. Гронка. Канапа. Кол. Ход. Мажор. Келіх. Пас. Сайт. Экстракт. Бор. Поле. Ігар. Фундук. Дабрабыт. **Па вертыкалі:** Мухамор. Кокс. Конюх. Арахіс. «Рэал». Эпоха. Шаша. Спад. Тальк. Тропік. Афіна. Рог. Какос. «Лад». Сеанс. Камера. Аброк. Мыс. Арба. Тата. Сінкопа. Лата. Корак. Трал. Статыст.

# ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ — ПАД УВЕСЬ КОШТ БУДАЎНІЦТВА?

**Апошнім часам сярод спецыялістаў будаўнічай галіны пачаліся весціся размовы аб магчымым змяненні ўмоў пры выдачы льготных крэдытаў насельніцтву пад будаўніцтва жылля. Аб якіх змяненнях можа ісці гаворка, паведаміў рэдакцыі начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр Горваль.**

Як вядома, сёння звычайныя чаргавікі маюць магчымасць атрымаць ільготны крэдыт з разліку 90 працэнтаў «нарматыўных» 20-квадратных метраў агульнай плошчы на чалавека. Для шматдзетных сем'яў і чаргавікоў у невялікіх населеных пунктах на льготных умовах крэдытуюцца 95 працэнтаў нарматыўнай жылплошчы. Аляксандр Горваль пацвердзіў карэспандэнту «Звязды», што цяпер спецыялістамі Мінбудархітэктуры распрацоўваецца адпаведны дакумент, які дазволіць чаргавікам атрымліваць ільготныя крэдыты пад усю жылплошчу кватэр. Магчымае новаўвядзенне па гэтым параметры будзе аднолькавым для ўсіх катэгорый ільготнікаў. Разам з тым, начальнік упраўлення ўдакладніў, што новыя ўмовы выдачы льготных крэдытаў будуць дзейнічаць толькі па новых дагаворах будаўніцтва і зваротнай сілы мець не будуць. **Чым выклікана такая ініцыятыва міністэрства?** Сутнасць у тым, што, згодна з пастановай Саўміна № 887, з пачатку наступнага года ўсе дамы для чаргавікоў будуць абавязкова будавацца з аздабленнем. Аляксандр Горваль паведаміў, што да апошняга часу даволі ўнушальная частка чаргавікоў адмаўлялася ад аздаблення, што рабіла будаўніцтва кватэр для іх прыкладна на 10—12 працэнтаў таннейшым. У выніку такія льготнікі маглі будаваць сабе жыллё нават у тым выпадку, калі ў іх не было ўласных сродкаў для фінансавання будаўніцтва гэтых 10 працэнтаў нарматыўнай жылплошчы. Узвядзенне дамоў для чаргавікоў з абавязковым аздабленнем можа выклікаць нават масавую адмову ад будаўніцтва менавіта сярод найбольш сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва, лічыць Аляксандр Горваль. Менавіта для памяншэння фінансавага цяжару падчас будаўніцтва жылля небагатымі чаргавікамі міністэрствам і падрыхтаваны праект аб ільготным крэдытаванні 100 працэнтаў нарматыўнай жылплошчы кватэр. Цяпер гэты праект знаходзіцца на стадыі ўзгаднення фінансавымі ўстановамі краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

## У чаканні цудаў

**Якім бы складаным і поўным праблем ні было наша жыццё, напярэдадні навагодніх святаў усім хочацца хоць ненадоўга зноў адчуць сябе дзіцем. Мы, дарослыя, як і яны, чакаем цуду, падарункаў, чароўнасці — усяго таго, што нясе з сабою самае любімае ўсімі свята — Новы год. Паводле ўсходняга календара, 2010 год — год Металічнага тыгра, і ўступіць ён у свае правы 14 лютага — у Дзень усіх закаханых, таму, будзем спадзявацца, што горды і мужны Тыгр у свой год падорыць нам адзін вялікі падарунак — каханне. Давайце пастараемся і сустрэнем яго незвычайна і радасна.**

**ВЫБІРАЕМ ПАДАРУНКІ**

Падарункі на Новы год і Каляды робяць практычна ўсе. Гэта даўняя добрая традыцыя. Аднак акрамя самога падарунка важна і тое, як яго паднесці. Вялікае значэнне варта надаць афармленню падарунка, бо так прыемна ўзяць у рукі не проста поліэтыленавы ці папяровы пакет, а нешта асаблівае, арыгінальна ўпрыгожанае. Адразу з'яўляецца адчуванне сюрпрызу, загадкі, таямніцы... Ды і падарунак у выніку запомніцца надоўга — відаць, рыхтавалі яго з любоўю і ўвагай!



Для невялікай упакоўкі будуць прыдатныя розныя падручныя матэрыялы: напрыклад, кардонкі з-пад абутку можна абклеіць каляровай ці бліскучай паперай, абрэзкамі арганзы, карункамі, дэкараваць бісерам, стразамі, маленькімі кветачкамі, зробленымі са стужак, ёлачнай мішурой, дробнымі шышкамі, пафарбаванымі серабрыстай ці залатой фарбай. Фантазіраваць на гэту тэму можна бясконца, час яшчэ ёсць!

## У лепшых традыцыях

Так павялося здаўна, што перад навагоднімі святамі мы ўпрыгожваем свой дом. Сімвалам гэтых святаў з'яўляецца ёлка. Яе ўпрыгажэнне — адно з найбольш прыемных і доўгачаканых момантаў. Як правільна гэта зрабіць? Дапамогуць нашы парады.

Спачатку вызначце прыдатнае месца, куды паставіць ёлку. Выбірайце тую частку пакоя, у якой будзе светла і не цесна. Звярніце ўвагу на тое, каб побач не было абагравальных прыбораў. Праверце, ці ёсць непадалёк электраразетка, каб можна было ўключыць гірлянду. Папярэдне праверце яе спраўнасць, разблытайце ўсе правады і акуратна павесьце на ёлку.

Цяпер можна раўнамерна развесіць буйныя яркія шарыкі. Не варта перагружаць імі ёлку, інакш яна будзе выглядаць занадта стракатай. Паміж буйнымі шарыкамі размясціце больш дробныя цацкі (шарыкі, шышкі, званочкі, розныя фігуркі). Сачыце за тым, каб цацкі спалучаліся паміж сабою па колерах. Найбольш аптымальнае рашэнне — упрыгожыць ёлку ў гаме з 2-3 колераў. Падвешваць цацкі можна на доўгіх атласных стужках ці на звычайных канцылярскіх сашчэпках. Прымацуйце на макаўцы верхавінку ці зорку. Калі іх у вас няма, завяжыце вялікі яркі бант. Засталося ўпрыгожыць нашу госцю бліскучай мішурой. Размяшчаць яе лепш вакол восі.

Апошнім часам стала модным упрыгожваць ёлкі пад срэбра ці золата. Калі вы трымаецеся гэтага стылю, памятайце, што нельга пры гэтым змешваць колеры. Адначасовае прымяненне залатой і сярэбранай мішуры будзе выглядаць проста безгустоўна.



Ёлку можна замяніць і невялікім букетам з яловых ці сасновых галінак. З імі выдатна спалучаюцца чырвоныя і жоўтыя ружы. А дадатковы шарм нададуць звычайныя навагоднія цацкі, арэхі, закручаныя ў фольгу, шышкі ці нават кавалачкі цытрусавых.

-2625-

СВЯТОЧНЫ СТОЛ

## Тыгр любіць мяса

**Тыгр — драпежнік, а г. зн., што стол павінен быць разнастайным, абавязкова з мяснымі стравамі.**

**САЛАТА «ЗІМОВЫ ВЕЧАР»**

*200 г ялавічыны, 50 г сушаных грыбоў, 3 салёныя агуркі, 2 бульбіны, 2 яйкі, 1 цыбуліна, 0,5 лімона, 1 морквіна, 0,5 бляшанкі зялёнага гарошку, 200 г маянэзу, соль, чорны перац, алей.*

Мяса адварыце ў падсоленай вадзе, парэжце кубікамі, злёгку абсмажце на алеі. Грыбы заліце халоднай вадой на дзве гадзіны, затым адварыце, ваду зліце, парэжце саломкай, цыбулю — тонкімі паўкольцамі. Бульбу, моркву і яйкі адварыце, астудзіце, парэжце кубікамі. Два агуркі парэжце кубікамі, трэці — кружочкамі. Зліце вадкасць з бляшанкі з гарошкам. Злучыце ўсе інгрэдыенты, запраўце маянэзам, пасаліце, паперчыце, перамяшайце. З кружочкаў салёнага агурка вылажыце «лічбы», а з зялёнай цыбулі — «стрэлкі» гадзінніка.

**СВЯТОЧНЫ РУЛЕТ**

*2 кг свіной шыі, 150 г сыру, 300 г брокалі, 1 морквіна, 1 бляшанка маслін без костачак, зяленіва пятрушкі і кропу, гарчыца, соль, перац на смак, алей.*

*Для ўпрыгажэння: памідоры, масліны, часнок, пятрушка.*



Кавалак мяса надрэжце пасярэдзіне не да канца, затым ад сярэдзіны зрабіце некалькі надрэзаў у розныя бакі, распластайце, адбіце з двух бакоў, намажце гарчыцай і пакіньце марынавацца на ноч. Моркву нарэжце брусочкамі, сыр натаркуйце, зяленіва і часнок пасячыце, злучыце з сырам, перамяшайце. Брокалі разрэжце на суквецці.

Замарынаванае мяса раскладзіце на дошцы, пасаліце, паперчыце, сырную сумесь пакладзіце пасярэдзіне, разраўняйце. Зверху пакладзіце брусочкі морквы, масліны і брокалі. Скруціце рулетам, замацуйце шпагатам. Абсмажце рулет з усіх бакоў на патэльні з алеем, затым закруціце ў фольгу. Запякайце ў духоўцы на працягу 2 гадзін.

Дастаньце рулет з духоўкі, дайце пастаяць 30 хвілін у фользе. Затым раскруціце, парэжце на кавалкі, упрыгожце па жаданні. Рулет можна падаць і як халодную страву, тады пакіньце яго астываць у фользе.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

## Пырскі шампанскага



**Ювелірна адкаркаваць гэты шыпучы напой — абавязковы атрыбут навагодняга стала — можа не кожны. Насамрэч сакрэт вельмі просты!**

1. Каб адкаркоўванне шампанскага не несла пагрозу ўсім, хто вас акружае, тэмпературу напою трэба давесці да +5—7 °C. Тады ціск будзе на трэць ніжэйшы, чым пры пакаёвай тэмпературы. Калі вы давядзяце бутэльку да аптымальнай тэмпературы, то не згубіце ні кроплі напою пры адкаркоўванні і зможаце даўжэй атрымліваць ад яго асалоду: пры нізкай тэмпературы яно выдыхаецца павольней. Дарэчы, і смак шампанскага адчуваецца лепш, калі яно ахалоджанае, прычым ахалоджваць яго перад ужываннем неабходна каля трох з паловай гадзін. Ні ў якім разе не кладзіце бутэльку з шампанскім у маразільную камеру!

2. Перад тым як адкаркаваць бутэльку, абкруціце яе сурвэткай ці ручніком, каб яна слізгацела ў руках, нахіліце пад вуглом 45°, круціце не корак, а бутэльку.

3. Нельга бутэльку з шампанскім трэсці — корак можа нечакана вылецець, і палова каштоўнага напою выльецца міма келіхаў.

-2626-

Дзве даты

## 19 снежня



**1595 год** — нарадзіўся Багдан Міхайлавіч Хмяльніцкі, украінскі дзяржаўны і ваенны дзеяч, палкаводзец, гетман Украіны. Паходзіў з сям'і дробнага праваслаўнага шляхціча, выхадца з Беларусі. Узначальваў Пераяслаўскую раду ў 1654 годзе, якая абвясціла ўз'яднанне Украіны з Расіяй. Памёр у 1657 годзе. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны заснаваў ордэн Багдана Хмяльніцкага трох ступеняў. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Баранавічах, Віцебску, Магілёве, Маладзечне і многіх іншых беларускіх гарадах.

**1917 год** — гульнямі ў Манрэалі і Атаве стартаваў першы рэгулярны чэмпіянат Нацыянальнай хакейнай лігі (НХЛ).

Цытата дня

***«Наша шчасце не заключаецца і не можа заключацца ў поўнай задаволенасці, пры якой не заставалася больш нічога жадаць, што спрыяла б толькі атупленню нашага розуму. Вечнае імкненне да новай дасканаласці — вось што ёсць сапраўднае шчасце».***

**Лейбніц Готфрыд Вільгельм (1646—1716), нямецкі філосаф, матэматык, фізік.**

# «САДЗЯЦЬ МАЛАДУЮ НА ПАСАД»

**Пасля таго, як родны брат прывядзе нявесту ў хату бацькоў, распачыналася выкананне яшчэ аднаго надзвычай эмацыйнага і бязмежна багатага сваім сімвалізмам абраду. Брат або іншы блізкі сваяк браў нявесту за руку і тройчы падводзіў да «пасада» — да дзяжы, якая стаяла ў самым пачэсным месцы хаты — у чырвоным куце, пад абразамі. Прысутныя сяброўкі-дружкі тым часам спявалі: *«Пастаньце, баяры, усе ў рад, садзяць маладую на пасад»*.**

● Такое высокае ганараванне нявесты ў кантэксце абрадавых падзей было цалкам заканамерным і апраўданым: усе старэйшыны роду, перш за ўсё тыя, хто валодаў тайнамі захавання традыцыі, публічна надзялялі прадстаўніка маладога пакалення — дзяўчыну-нявесту — правам працягваць род на наступным вітку яго адвечнага жыцця.

● У самым свяшчэнным месцы хаты — непасрэдна пад сямейнымі абразамі нявесту садзілі на незвычайны трон — сямейную дзяжу, якую папярэд накрывалі вывернутым на левы бок (поўсцю наверх) кажухом. Яна, ідучы міма гасцей, павінна была пакланіцца кожнаму — і старому, і малому.

● Лічылася, калі «несумленная» нявеста схавае свой грэх і сядзе на дзяжу, то гэтым учынкам апаганіць яе (дзяжу), за што будзе пакарана ўся сям'я: у найбліжэйшыя сем гадоў не будзе радзіць хлеб, весціся жывёла, нараджацца дзеці. А рошчына ў дзяжы не будзе падымацца, адпаведна хлеб увесь час будзе ацеслівым.

● Сімвалічны кантакт дзяўчыны з рошчынай быў скіраваны на тое, каб ёй перадаліся здольнасць зацяжараць і прыбываць у вазе — «расці».

● Другім атрыбутам, які быў уключаны ў кантэкст выканання абраду пасаду нявесты на дзяжу, з'яўляўся вывернуты поўсцю наверх **кажух**. Гэта яшчэ адзін, здавалася б, будзённы прадмет хатняга ўжытку, які ў кантэксце вяселля раптам надзяляўся надзвычайным прадуцыравальным статусам і на працягу ўсёй святочнай цырымоніі станавіўся неад'емным атрыбутам-спадарожнікам маладых. На гэтым кажуху жаніх і нявеста будуць сядзець на працягу ўсяго вяселля, а таксама пад яго покрывам правядуць першую шлюбную ноч.

● У сувязі з тым, што да самай недатыкальнай сямейнай рэліквіі — дзяжы — атрымлівалі доступ многія з аднавяскоўцаў, яе імкнуліся засцерагчы самымі адмысловымі абярэгамі. У дзяжу клалі хлеб з соллю, якія выконвалі ролю абярэга хатняга ачага.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Усміхнемся!

Оталарынголаг правярае слых пацыента:

— Дваццаць...

— Ад дурня чую!

☺

**Дзе ўначы ўпаў, там і планетарый...**

☺

— Сёма, чаму б вам не ажаніцца з Софачкай? Ну, падумаеш — крышку касая!

— Крышку?! Ды калі яна плача, у яе слёзы цякуць па спіне крыж-накрыж!

☺

**Як ні біліся расійскія навукоўцы, а Косця Цзю робіць гэта лепш.**

☺

— Алё! Сідарава можна?

— Ён цяпер прымае ванну!

— Перадайце гэтай ванне, што я ёй вока выдрапаю!



Парламенцкія дэбаты

# ЗАВОЧНІКІ ПОЙДУЦЬ У ВОЙСКА?

## Адтэрміноўка для іх — пад пагрозай скасавання

Пад заслону дэпутаты спрацавалі нечакана ажыўлена. Даўно ўжо Авальная зала не знала такой яркай і актыўнай дыскусіі. Спрэчкі разгарэліся вакол законапраекта аб воінскім абавязку і воінскай службе. А дакладней, той нормы, якая адмяняе адтэрміноўку ад службы ў войску завочнікам (і ў ССНУ, і ў ВНУ). Новаўвядзенне прапаноўваецца з падачы Мінабароны. Першы намеснік міністра Пётр ЦІХАНОЎСКІ, выступаючы ў парламенце, патлумачыў, што прапанова аб адмене адтэрміноўкі выклікана штогадовым скарачэннем колькасці прызыўных рэсурсаў для забеспячэння абароны і ваеннай бяспекі дзяржавы. Паводле прыведзеных ім звестак, колькасць мужчын, прыдатных да ваеннага прызыву, якім споўнілася 18, штогод скарачаецца на 5 — 7 працэнтаў (калі яшчэ два гады таму прыдатнымі былі прызнаныя 58 працэнтаў прызыўнікоў, то сёлета — прыблізна 41 працэнт). Першы намеснік міністра выказаў меркаванне, што ў наступныя некалькі гадоў сітуацыя не зменіцца. Ён не ўпусціў магчымасці заўважыць, што Беларусь мае найбольшую колькасць падстаў для адтэрміноўкі (28) у параўнанні з краінамі СНД. У Расіі, напрыклад, толькі 21 прычына для непрызыву. Пры гэтым у Беларусі адтэрміноўку «па адукацыі» атрымліваюць больш як 164 тыс. прызыўнікоў ад 18 да 26 гадоў (з іх каля 36 тыс. — завочнікі). Прааналізаваўшы сітуацыю, у Мінабароны і вырашылі скасаваць адтэрміноўку для завочнікаў.

Прапанаваная папраўка выклікала неадназначную рэакцыю ў Авальнай зале. Некаторыя народныя абраннікі ўступіліся за завочнікаў, іншыя ж, наадварот, цвёрда стаялі на пазіцыях адмены адтэрміноўкі. Вытрымкі з выступленняў дэпутатаў мы зводзім разам, канструюючы своеасаблівы палілог — гэткія газетныя дэбаты.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе:**

— Што лепш для нашай арміі — баец-малалетка, прызваны ў рады ўзброеных сілаў пасля двух-трох месяцаў вучобы ў завочнай форме, ці дарослы баец з завершанай адукацыяй больш высокага ўзроўню? Што лепш для эканомікі краіны — слаба падрыхтаваны чалавек ці чалавек, які атрымаў больш якасную адукацыю, бо не перарываў вучобу? Адказы відавочныя. Дык навошта тады такая спешка? Няхай хлопцы-завочнікі атрымаюць дыплом, тады і прызывайце. У гэтай норме ёсць фінансавая няпэўнасць. У завочнай форме грамадзяне Беларусі атрымліваюць адукацыю ў пераважнай большасці на ўмовах аплаты, і залічэнне праводзіцца толькі пасля выплаты грашовых сродкаў. Уявіце сітуацыю: чалавек паступіў, заплаціў, давучыўся да снежня, сесію, натуральна, не здаваў — і яго прызвалі ў армію. Пасля службы ён зноў будзе залічаны на той жа курс, але толькі пасля новай аплаты. Хто яму верне патрачаныя раней грошы — ВНУ, войска? Хто дасць гарантыю, што пасля службы прыватнік ці дзяржустанова прымуць гэтага чалавека на папярэднюю працу, якая дазваляе аплачваць вучобу? Гэтыя пытанні да канца ў законе не прапрацаваныя. І мне падаецца, вырашаючы сваю праблему, Міністэрства абароны стварае вельмі сур'ёзныя праблемы Міністэрству адукацыі ў часці функцыянавання ССНУ і ВНУ. Гаварыць аб меркаваным зніжэнні забеспячэння абароны і ваеннай бяспекі дзяржавы з-за недахопу людскіх рэсурсаў, мне падаецца, дачасна. Сапраўды, з-за дэмаграфічнай сітуацыі, адпаведна з пададзенай нам табліцай (у абгрунтаванні неабходнасці прыняцця закона. — **Аўт**.), колькасць грамадзян мужчынскага полу, якія падлягаюць уліку ўпершыню, праз 10 гадоў зменшыцца ў два разы. Але ж не ўвогуле мужчын, а тых, што падлягаюць штогадоваму першапачатковаму прыёму на воінскі ўлік. І калі, напрыклад, 19-гадовых цяпер 83 тыс., то дададзім да іх яшчэ 140 тыс., якія маюць адтэрміноўкі. Акрамя таго, значная колькасць маладых людзей навучаецца на ваенных кафедрах у грамадзянскіх ВНУ. І па заканчэнні вучобы яны таксама могуць быць прызваныя на службу. Каля 14 тыс. студэнтаў штогод адлічаецца толькі з ВНУ, і яны страчваюць права на адтэрміноўку. Выбраць ёсць з чаго. Канцэпцыяй праекта з'яўляецца захаванне колькаснага параметра кантынгенту вайскоўцаў тэрміновай службы, але гэту задачу сілавому міністэрству варта вырашаць не прымітыўным сілавым метадам — не за кошт студэнтаў-завочнікаў, а то, ідучы такім шляхам, мы пачнем прызываць выхаванцаў дзіцячых садкоў. Трэба шукаць іншыя спосабы, у тым ліку за кошт маральнай і матэрыяльнай зацікаўленасці маладых людзей служыць у арміі. І калі трэба падняць статус вайскоўца тэрміновай службы, давайце разам папрацуем над гэтым, напішам адпаведнае палажэнне ў закон. Магчыма, сумесна з Міністэрствам адукацыі трэба падумаць пра скарачэнне прыёму на навучанне ў завочнай форме на ўмовах аплаты — мы падтрымаем гэту тэндэнцыю, таму што пытанне вельмі актуальнае. У некаторых ВНУ завочнікаў больш як 90 працэнтаў. Але галоўнае — трэба шукаць прычыны, па якіх пэўная частка маладых людзей стараецца, як кажуць, «адкасіць» ад службы, і ліквідаваць гэтыя прычыны. І адна з іх усім вам вядомая — маладыя людзі баяцца, што ў арміі з іх будуць здзекавацца і што там можна страціць здароўе. Хто дасць гарантыю, што гэтага не адбудзецца?..

Для авалодання сучаснымі армейскімі спецыяльнасцямі пераважна неабходныя ўжо не фізічная моц і вынослівасць, а мазгі. Нам патрэбная не колькасць, а якасць, таму давайце захаваем нашым маладым людзям магчымасць развіць тое, што ў іх знаходзіцца пад чарапной каробкай, а прызываць у войска будзем пасля атрымання дыплома. І я прашу профільную камісію і Міністэрства абароны ўлічыць усё гэта пры дапрацоўцы праекта да другога чытання.

**Ігар КАРПЕНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД:**

— Такой рэдакцыяй гэтага артыкула (які адмяняе адтэрміноўку завочнікам. — **Аўт**.) мы парушаем галоўны прынцып роўнага доступу да адукацыі, які закладзены ў нас ва ўсіх нарматыўных актах аб адукацыі... Каб вучыцца на завочнай форме, неабходна ўладкавацца на працу — гэта абавязковае патрабаванне сёння. Што такое школьнік, які закончыў школу, ён што, адразу можа ўладкавацца на працу, здаць іспыты і пайсці на завочнае? Як правіла, завочнікі — гэта людзі, якія ўжо ўладкаваліся на працу, і значыць, быў час іх прызваць. Кажучы пра роўны прынцып, давайце паглядзім — ці вернемся да той савецкай сістэмы, калі ўсе, хто паступаў у ВНУ, праз год сыходзілі і служылі, а потым вярталіся і давучваліся. І тады не глядзелі — завочнае, дзённае... Вось гэта роўны падыход. Ці давайце захаваем тую норму, якая ёсць у нас, і дадзім магчымасць усім на розных формах навучання вучыцца ў роўных умовах... Я заклікаю профільную камісію сумесна з дэпутацкім корпусам папрацаваць па гэтым артыкуле і да другога чытання прыняць узважаны, дыхтоўны дакумент.

**Віктар ГУМІНСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы:**

— Тут казалі, што Міністэрства абароны вырашае сваю праблему. Яно вырашае дзяржаўную праблему — ваенная бяспека краіны... Казаў Уладзімір Мацвеевіч, няхай завочнікі адвучацца, прыйдуць адукаванымі, але ж міністэрства агучыла лічбу — колькі завочнікаў прыходзіць у сілавыя структуры — ажно 16 працэнтаў! А дзе астатнія 84 працэнты — вось пытанне. Вось яна, якасць... Ёсць магчымасць службы ў рэзерве — чалавек без адрыву ад вытворчасці можа атрымаць ваенна-ўліковую спецыяльнасць. І гэта магчымасць выкарыстоўваецца па поўнай праграме. Сёння Міністэрства абароны, уносячы такі законапраект, думае пра дзяржаўныя інтарэсы, і нам таксама не павінна быць без розніцы, хто будзе ахоўваць нашы межы, паветраную прастору, хто будзе баявую і мабілізацыйную гатоўнасць забяспечваць... Вядома ж, тут узнікаюць пытанні і з аплатай, я тут згодны з Уладзімірам Мацвеевічам, іншыя пытанні ўзнікаюць, я падтрымліваю выступоўцаў у тым плане, што мы, вядома, да другога чытання, улічваючы, што гэта не канцэптуальная папраўка, павінны вельмі ўважліва падысці да гэтага пытання... Трэба дасканала разабрацца... Давайце вернемся да іншых адтэрміновак, навядзём у гэтым плане парадак...

**Святлана ШЫЛАВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі:**

— Я поўнасцю падтрымліваю Міністэрства абароны і профільную камісію... Мы з вамі ўступаем у дэмаграфічную яму 90-х гадоў, калі ў нас упала ўзнаўленне насельніцтва і нараджальнасць, і колькасць дзяцей да 15 гадоў у нас скарацілася больш чым на 400 тыс. чалавек. І калі мы сёння будзем вызваляць ад служэння ў войску па любых, магчыма, нават неабгрунтаваных прычынах, у нас хутка не будзе каму абараняць нашы межы. Да гэтага трэба падысці асцярожна...

Нягледзячы на дыскусійнасць разгляду, тых, хто прагаласаваў бы супраць прыняцця законапраекта ў першым чытанні, у Авальнай зале не было. Застаецца спадзявацца, што нешта зменіцца да другога чытання...

**Ад аўтара:** Пазіцыя Мінабароны вытлумачальная: прызыўныя рэсурсы скарачаюцца, значыць, трэба знайсці тых, хто запоўніць прагалы. Адменім адтэрміноўку — павялічым прызыўны кантынгент. Але ж гэта не выйсце. Што, калі параненейшаму будзе не хапаць прызыўнога кантынгенту — пашыраць узроставыя межы? Пачнуць прызываць хворых? Закрыюць вочы на асацыяльнасць асобаў, збяруць злачынцаў у войску? Чаго добрага, яшчэ і жанчын змусяць абараняць краіну — іх жа больш, чым мужчын, і жывуць яны, паводле сведчанняў дэмографаў, даўжэй... Можа, варта перагледзець сістэму ў цэлым? Разгледзець магчымасці пераходу да прафесійнай арміі, а не адмахвацца адзіным «гэта дорага»? Узяць на ўлік практыку альтэрнатыўнай службы? А пытанні бяспекі ў самім войску? Ну, скажыце, хто з нас не чуў пра дзедаўшчыну з расповедаў калі не блізкіх, то знаёмых? І пасля гэтага я ніколі не стану папракаць хлопца, які не хоча ісці ў армію. Ну, не павінна гэта быць прымусовым! Мы ж не прымушаем усіх атрымліваць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «ядзерная фізіка» або паказваць сябе ў спорце высокіх дасягненняў, воінская служба — на мой погляд — таксама не ўніверсальны занятак. І можа, за той год, што юнак праводзіць у войску, ён прынёс куды больш карысці на іншым месцы — на сваім... Мне падаецца, сёння нельга ўспрымаць патрыятызм так аднабока: хто не служыў, той не патрыёт. Дайце яму праявіць сябе ў іншым, у тым, да чаго ў яго ёсць схільнасці. І мужнасць сваю праявіць таксама можна не толькі ў вайсковай службе. А ў штодзённых рашэннях — няпростых, цвёрдых, адказных і... правільных.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# «СЁННЯ ДЛЯ МЯНЕ РУХНУЎ БАР'ЕР У АДНОСІНАХ БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ»

**Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб Лабадзенка суправаджаў міністра культуры Польшчы Богдана Здраеўскага ў час візіту ў Мінск і Нясвіж**

Візіт міністра культуры Польшчы Богдана Здраеўскага 17 снежня пачаўся перамовамі з міністрам культуры Беларусі Паўлам Латушкам. Спачатку сам-насам, пасля — у пашыраным складзе, з памочнікамі і калегамі. На выніковай прэс-канферэнцыі прагучала некалькі цікавых навінаў. Напрыклад, што 2010 год у Беларусі абвешчаны Годам Шапэна. Пры вялікім жаданні можна нават знайсці сувязі Шапэна з Беларуссю. Напрыклад, наш славуты мастак і кампазітар Напалеон Орда сябраваў з Шапэнам у час знаходжання ў Парыжы. Імя Шапэна, як мы паведамлялі, атрымала мінская музычная школа №3.

Ажыўленне журналістаў выклікалі словы спадара Латушкі пра магчымае супрацоўніцтва са славутым польскім рэжысёрам Кшыштафам Занусі.

— Магчыма, сваю наступную стужку спадар Занусі здыме ў Беларусі. Цяпер мы вядзём перапіску са славутым рэжысёрам на гэтую тэму, — сказаў спадар Павел.

«Звязда» пацікавілася ў міністраў наконт праблемы вяртання каштоўнасцяў.

— Ці абмяркоўвалі спадары міністры пытанне рэстытуцыі: вярнуць беларусам карціны, якія былі вывезеныя ў Польшчу, і вярнуць польскім радам маёнткі, якія засталіся ў Беларусі?

— Гэта вельмі складанае пытанне, ім павінны займацца прафесіяналы. На сённяшні дзень актыўна ідзе працэс вяртання каштоўнасцяў хоць бы ў выглядзе копій — нядаўна ў Варшаве мы перадалі Беларусі 48 копій Радзівілаўскіх партрэтаў, — адказаў пан Здраеўскі.

— Наконт маёнткаў магу сказаць: сёння гэта ўласнасць Рэспублікі Беларусь, і так будзе, — зазначыў са свайго боку Павел Латушка. — Але мы, вядома, зацікаўленыя ў аднаўленні нашай гісторыка-архітэктурнай спадчыны, і гатовыя разгледзець пытанне супрацоўніцтва з нашчадкамі гэтых радоў, абмеркаваць шляхі вырашэння пытання на розных умовах.

### «Палескія абразы XVI стагоддзя — гэта сапраўдны цуд!»

Пасля прэс-канферэнцыі міністр Здраеўскі накіраваўся ў Нацыянальны мастацкі музей.

— Цяпер у нас экспануецца цэлая серыя карцін Івана Хруцкага, якую мы можам прапанаваць на выставу Нацыянальнаму музею ў Варшаве. А ўзамен папросім у вас на выставу арыгіналы партрэтаў Радзівілаў, — звярнулася да спадара міністра Надзея Усава, намесніца дырэктара музея.

Богдан Здраеўскі агледзеў практычна ўсю экспазіцыю музея. Асаблівую цікавасць высокага госця выклікалі палескія абразы XVI стагоддзя, напісаныя на грубых дошках тэмперай — фарбай на аснове яечнага жаўтка.

— Які цікавы эфект стварыў майстар — твар святога аб'ёмны, а адзенне і фон — плоскія! — з захапленнем адзначыў міністр. — Адразу хочацца разглядаць твар, а пасля — усё астатняе. Выдатная расстаноўка акцэнтаў!.. Вашыя палескія абразы — гэта сапраўдны цуд!

Безумоўную цікавасць пана Здраеўскага выклікалі партрэты Радзівілаў. Праўда, польскага міністра гэтым не здзівіш — у 1950-я гады абсалютна злачынным рашэннем савецкія ўлады перадалі пераважную большасць партрэтаў з Мінска ў Варшаву. І назад ніхто гэта не адкруціць...

— А вось гэтыя два малюнкі Фалата віселі ў Нясвіжскім замку, — падказаў міністру амбасадар Польшчы Генрык Літвін. — І пані Эльжбета Радзівіл, калі іх пабачыла, узгадала!..

Спадар Здраеўскі адзначыў кампактную і прадуманую экспазіцыю новага корпуса музея. На невялікай плошчы ўдалося паказаць і беларускае мастацтва, і заходнееўрапейскае, і нават усходняе.



**У Нацыянальным мастацкім музеі міністра Здраеўскага найбольш уразілі палескія абразы XVI стагоддзя.**

### «Оперны тэатр: канапа, падлога і парапет»

Наступным пунктам наведвання стала мінская опера. Шыкоўна аднаўлены будынак, абсталяваны па апошнім піску тэхнічнай моды. Аднак у мяне з'явілася лёгкае адчуванне, што я трапіў на акцыю «Купляйце беларускае».

— Вось гэтыя канапы выраблены ў Беларусі. Вы думаеце, гэта дэрмацін? Нічога падобнага — гэта натуральная скура! Тут усё натуральнае! А ў падлозе выкарыстана дзевяць відаў каменю, а парапеты ў нас гранітныя... А вось тут кавярня на 60 месцаў, а вось тут ліфт для інвалідаў...

Пры аглядзе ліфта для інвалідаў мне згадаўся нядаўні выпадак, калі ахоўнік опернага тэатра не пусціў на парог чалавека ў інвалідным вазку... А ўвогуле здалося, што расповед пра тэатр мусіць закранаць найперш творчасць, а не канапы і парапеты... Часам пану Здраеўскаму не ўдавалася хаваць нецікавасць да «матчасткі» — ён адставаў ад групы, разглядаў здымкі на сценах, у зале — адышоў на іншы край балкона, каб праверыць акустыку. Твар групы ратаваў пан Вальдэмар Дамброўскі, дырэктар Варшаўскай оперы, які з непадробленай цікавасцю распытваў, колькі лямпачак і з якіх пунктаў могуць адначасова асвятляць сцэну. А выслухаўшы расповед, з прыемнасцю заўважыў:

— Варшаўская опера ў тры разы большая па памеры. А нашая сцэна лічыцца самай вялікай у свеце — 66 метраў у дыяметры. Але я не хвалюся, бо такая вялікая сцэна — гэта сапраўдная праблема...

Асаблівае захапленне пана Дамброўскага выклікалі вельмі сучасныя механізмы сцэны.

— Я вас запрашаю ў лютым на прэм'еру «Травіяты», — звярнуўся ён да дырэктара нашай оперы Уладзіміра Грыдзюшкі. — Я бачу, што нам ёсць што абмеркаваць і якім досведам узаемна падзяліцца!

### «2010 год будзе пераломным у адносінах Беларусі і Польшчы»

Фіналам візіту стала наведванне Нясвіжа. Вядома, для польскага міністра гэта знакавае месца, бо ён цудоўна ведае гісторыю, разумее значнасць роду Радзівілаў у нашым супольным мінулым. Пасля экскурсіі ў ратушы пана Здраеўскага просяць пакінуць запіс у кнізе ганаровых гасцей. І спадар міністр абсалютна шчыра піша, што невыказна рады гэтаму прыезду ў Нясвіж, што ўражаны ім.

У касцёле Божага Цела гасцям распавядаюць як пра мастацкую і гістарычную вартасць помніка, так і пра праблемы. Зусім нядаўна са столі адваліўся кавалак фрэскі, дах патрабуе неадкладнай замены... У крыпце, сямейнай пахавальні Радзівілаў, міністр кажа, што ўражаны яе захаванасцю. Ксёндз Пётр адказвае:

— У гэтым, пане міністру, вялікая заслуга ксяндза Каласоўскага — анёла-абаронцы нашага храма, які ўратаваў яго падчас ваеннага пажару, падчас бальшавіцкага ваяўнічага атэізму. Уратаваў і крыпту, нікога сюды не пускаючы.

Ксёндз дзякуе міністру, бо на польскія грошы ў гэтым годзе была зробленая дрэнажная сістэма, якая літаральна ўратавала крыпту — сюды ручаямі лілася вада з вуліцы...

У канцы насычанага дня міністр Здраеўскі адказаў на некалькі пытанняў карэспандэнта «Звязды».

**— Пане міністру, якія вашыя ўражанні ад візіту?**

— Я жыва зразумеў, наколькі мы блізкія народы, наколькі блізкая нашая супольная гісторыя!.. Шкада толькі змарнаванага часу, калі мы амаль не мелі кантактаў, нягледзячы на тое, што з'яўляемся суседзямі. Гэты страчаны час трэба тэрмінова наганяць, будаваць масты. У найбліжэйшых планах — супрацоўніцтва ў сувязі з Годам Шапэна, супольнае святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Мае перамовы з міністрам Латушкам надзвычай плённыя. Мы распачынаем супрацоўніцтва мастацкіх школ, бібліятэк, оперы, музеяў. Мы абмяркоўвалі пытанні падтрымкі творчай моладзі. Сённяшні дзень азначае для мяне пераход пэўнага бар'еру ў сумеснай працы нашых краін.

**— На прэс-канферэнцыі прагучала тэма захавання супольнай спадчыны...**

— Беларусь мае ў сваёй культуры фенаменальныя імёны, месцы і падзеі. Гродна... Навагрудак... Міцкевіч... Грунвальд... «Галька» Манюшкі... Гэта ўсё сёння не працуе ў Еўропе, а павінна. І значны кавалак працы па прасоўванні гэтага мы павінны рабіць разам. Немагчыма падзяліць між Польшчай і Беларуссю творчыя здабыткі Станіслава Манюшкі, Чэслава Немана, спадчыну Радзівілаў... Мы павінны будаваць масты, а не бар'еры. Я не люблю палітыкі, бо палітыка будуе часам бар'еры там, дзе іх не павінна быць. Акурат культура з'яўляецца шанцам на будаванне брамаў, вялікіх сувязяў, камунікацыяў.

**— Якія найбліжэйшыя планы ў супрацоўніцтве нашых краін?**

— Год 2010 будзе пераломным — у добрым сэнсе. Гэта будзе Год Шапэна, мы будзем працаваць далей з агульнай спадчынай Станіслава Манюшкі, у тым ліку і фінансава. Такое супрацоўніцтва мусіць быць таксама і ў Гродне, і ў Нясвіжы. З лютага мы распачынаем супрацоўніцтва Нацыянальнай оперы Польшчы і нацыянальнай оперы Беларусі. Гэта, можа быць, перапом. Я запрасіў пана міністра культуры Латушку ў Польшчу. Гэта не будзе яго першы візіт у Польшчу *(усміхаецца)*, бо спадар Латушка 6 гадоў быў амбасадарам Беларусі ў Польшчы. І я хачу, каб наступны год прынёс нам вялікія зрухі ў культурным супрацоўніцтве. І, спадзяюся, не толькі.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## З АСВЕНЦІМА ВЫКРАЛІ ЛОЗУНГ «ARBEIT MACHT FREI»

**У ноч на 18 снежня невядомыя зламыснікі выкралі частку металічных варот з лозунгам «Arbeit macht Frei» («Праца вызваляе»), які быў замацаваны над уваходам на тэрыторыю былога канцэнтрацыйнага лагера ў Асвенціме. Учора ў супрацоўнікаў праваахоўных органаў не атрымалася выйсці на след злачынцаў.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Канцэнтрацыйны лагер трэцяга рэйха ў Асвенціме дзейнічаў падчас Другой сусветнай вайны. З чэрвеня 1940 года на тэрыторыю лагера пачалі прывозіць вязняў з Польшчы, СССР, Аўстрыі, Бельгіі, Чэхаславакіі, Даніі, Францыі, Грэцыі, Галандыі, Югаславіі, Нарвегіі, Румыніі, Італіі і Венгрыі. Музей на тэрыторыі лагера занесены ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Штогод яго наведвае каля мільёна чалавек.

## БЕСПРАЦОЎЕ Ў РАСІІ ЗНОЎ ПАЧАЛО РАСЦІ

**Колькасць беспрацоўных у Расіі да канца лістапада, паводле папярэдніх звестак, склала 6,131 мільёна чалавек, або 8,1 працэнта эканамічна актыўнага насельніцтва. Аб гэтым гаворыцца ў афіцыйных матэрыялах Расстата.**

На месяц раней беспрацоўных у краіне налічвалася 5,839 мільёна чалавек, а ўзровень беспрацоўя складаў 7,7 працэнта.

## САЛЮТ З-ПАД КРЫСА

Штодзённыя рэйды на Гомельшчыне выяўляюць усё новых і новых прадаўцоў піратэхнічных забаў. У Мазыры на тэрыторыі рынку «Магістраль» супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі УУС аблвыканкама затрыманы непрацуючы жыхар Калінкавічаў, які прапаноўваў грамадзянам набыць у яго салютныя прылады і феерверкі. Ён іх захоўваў у пад'ездзе дома. У выніку грамадзянін быў пазбаўлены небяспечных цацак. Аналагічныя прылады былі знойдзены і ў іншага жыхара Мазыра. Склад, у якім было 3178 штук піратэхнічных вырабаў, знаходзіўся ў гаражы. Некалькі менш — 2701 адзінка канфіскавана ў гамяльчаніна, затрыманага на прывакзальнай плошчы. Яшчэ адзін жыхар абласнога цэнтра прадаваў петарды на цэнтральным крытым рынку Гомеля. У яго пры сабе былі піратэхнічныя сродкі ў колькасці 1706 штук.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ГРАМАДСКАЯ ДУМКА АБ СТАНЕ КАРУПЦЫІ І ЭФЕКТЫЎНАСЦІ БАРАЦЬБЫ З ЁЮ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Паводле звестак, атрыманых у выніку сацыялагічнага даследавання, якое праведзена Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у III квартале 2009 г., наяўнасць карупцыі ў беларускім грамадстве адзначаюць **65,7 %** апытанага насельніцтва краіны. Разам з тым, большасць рэспандэнтаў лічаць, што асноўнымі крыніцамі фарміравання думкі аб распаўсюджванні ў грамадстве карупцыі з'яўляюцца міфічныя ўяўленні грамадзян. **Больш як 46 %** удзельнікаў апытання адзначылі, што іх асабістыя ўяўленні аб гэтай сацыяльнай з'яве сфарміраваныя на падставе чутак і інфармацыйных паведамленняў, перададзеных па тэлебачанні, апублікаваных у прэсе або атрыманых з інтэрнэту (гл. дыяграму 1).

Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў на пытанне

**«На чым перш за ўсё грунтуецца ваша думка аб ступені распаўсюджанасці карупцыі ў канкрэтных сферах дзейнасці, установах, арганізацыях?»**

*(у % ад ліку апытаных)*

Дыяграма 1




Колькасць рэспандэнтаў, якія паказалі на «асабісты ўдзел» у карупцыйных праявах, у некалькі разоў меншая — усяго каля 9 % апытаных (гл. дыяграму 2).

Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў на пытанне

**«Ці даводзілася вам асабіста за апошні год рабіць неафіцыйныя выплаты або паслугі якім-небудзь службовым асобам, работнікам, ад якіх залежала вырашэнне цікавага для вас пытання (у дзяржустановах, на працы, у іншых месцах)?»**

*(у % ад ліку апытаных)*

Дыяграма 2




У гэтым жа даследаванні адзначаецца, што, на думку насельніцтва, з карупцыяй у Беларусі вядзецца непрымірымая барацьба. **Захады**, якія робяцца дзяржавай **па выкараненні гэтай з'явы, пазітыўна ацэньвае большасць беларускіх грамадзян — 67,6 %** (гл. дыяграму 3).

Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў на пытанне

**«Як вы ацэньваеце захады па барацьбе з карупцыяй у рэспубліцы, якія робіць дзяржава?»**

*(у % ад ліку апытаных)*

Дыяграма 3




Найбольш эфектыўнай структурай у барацьбе з карупцыяй, на думку насельніцтва, цяпер з'яўляецца Камітэт дзяржаўнага кантролю (КДК) — так выказаліся 44,0 % апытаных. Камітэт дзяржаўнай бяспекі (КДБ) займае другое месца — 31,4 % адказаў, затым ідзе пракуратура — 29,8 % (гл. дыяграму 4).

Размеркаванне адказаў рэспандэнтаў на пытанне

**«Якія праваахоўныя і іншыя органы цяпер, на ваш погляд, найбольш эфектыўна ажыццяўляюць барацьбу з карупцыяй?»**

*(у % ад ліку апытаных)*




Дыяграма 4

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчыкі могуць выйграць электрафены, пыласосы, тэлевізары, печ ЗВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 студзеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **па 25 сакавіка 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 25 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 25.11.09.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 25.11.09 па 30.03.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1597 ад 23.11.09, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

6 **Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на І кв. або 1–е паўг. 2010 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ____________________ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ____________________ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ____________________ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

